# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## П'ЯНЫЯ АХОЎНІКІ ФАТАГРАФАВАЛІСЯ НА ТРОНЕ

**Супрацоўнікі службы бяспекі каралевы Вялікабрытаніі ладзілі п'янкі ў Букінгемскім палацы, падчас якіх фатаграфаваліся на троне, а затым адсыпаліся проста ў каралеўскіх пакоях. Скандальныя факты выявіліся падчас суда над адным з ахоўнікаў Полам Пэйджам, якога абвінавачваюць у махлярстве.**



Як расказалі прысяжным, ахоўнікі арганізавалі на тэрыторыі палаца продаж наркотыкаў і парнаграфіі. Акрамя таго, за спецыяльную плату яны праводзілі на палацавыя прыёмы невядомых людзей, а таксама дазвалялі сваім знаёмым выкарыстоўваць тэрыторыю каля палаца ў якасці аўтастаянкі. Па меркаванні суда, сваімі ўчынкамі паліцэйскія прадэманстравалі непашану да каралевы, а таксама падставілі яе жыццё пад рызыку. Самі паліцэйскія большасць абвінавачванняў адмаўляюць. Сяржант Адам Макгрэгар заявіў, што сесці на каралеўскі трон яго прымусіла не непавага да манархаў, а «жаданне распавесці аб гэтым унукам». Акрамя таго, ён сцвярджае, што не надзяваў пры гэтым карону.

## У ІРЛАНДЫІ Ў АДСТАЎКУ АДПРАЎЛЕНЫ КАБІНЕТ МІНІСТРАЎ

**Прэм'ер-міністр Ірландыі Брайан Коуэн адправіў у адстаўку ўсіх 20 дзяржаўных міністраў.**

Кіраўнік ірландскага ўрада такім чынам спадзяецца павысіць эфектыўнасць дзейнасці кабінета міністраў і зменшыць выдаткі нацыянальнай казны ў сувязі з наступленнем рэжыму строгай эканоміі, з якім парламент азнаёміўся два тыдні таму ў экстранным бюджэце. Таксама надалей плануецца, што новых міністраў будзе ўжо 15, але апазіцыя лічыць, што дастаткова і 12.

## ПРЭМ'ЕР САМАЛІ ПРОСІЦЬ НЕ ПЛАЦІЦЬ ПІРАТАМ

**Прэм'ер-міністр Самалі Амар Абдзірашыд Алі Шармарке папрасіў дзяржавы, якія пакутуюць ад піратства ў Адэнскім заліве, не плаціць марскім разбойнікам выкупы.**



«Адзіная прычына, па якой людзі становяцца піратамі, — гэта тое, што кампаніі-суднаўладальнікі вырашаюць плаціць ім грошы», — заявіў Шармарке. Прэм'ер Самалі таксама выказаў сумненне ў эфектыўнасці заходніх метадаў барацьбы з піратамі. Па яго словах, замежныя ваенныя караблі, якія патрулююць узбярэжжа краіны, «ні на дзюйм не перашкодзілі» марскім бандам. Шармарке падкрэсліў, што адзінай магчымасцю перамагчы піратства з'яўляецца стварэнне наземнай службы бяспекі. У сувязі з гэтым ён папрасіў сусветную супольнасць дапамагчы Самалі ў стварэнні такой службы, на якую ўраду трэба 165 мільёнаў долараў.

## БУЙНАМУ ПАДСУДНАМУ ЗАЛЯПІЛІ РОТ

**Суддзя ў горадзе Покатэла ў штаце Айдаха (ЗША) загадаў судовым прыставам заляпіць рот буйнаму падсуднаму.**

Слуханні па справе 23-гадовага Нікласа Фрэйжара, умоўна асуджанага за крадзеж, пачаліся з таго, што прызначаны дзяржавай адвакат папрасіў праверыць даверніка на наяўнасць свядомасці. Гэта абурыла падсуднага, які заявіў, што выдатна сябе адчувае, валодае пачуццём гумару, даволі прывабны і можа хадзіць на руках. Суддзя неаднаразова заклікаў Фрэйжара да парадку, але той не рэагаваў і настойваў на сваёй невінаватасці. У выніку старшыня загадаў прыставам супакоіць падсуднага. Працэс на некалькі хвілін перапыніўся, пакуль шукалі клейкую стужку, і маладому чалавеку заляпілі рот.

# Кожнаму — па «шэрай» цыгарэце?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Больш пэўна можна сказаць пра іншае: з сярэдзіны 2010 года плануецца ліквідацыя пунктаў прыняцця паведамленняў на расійска-беларускай мяжы.

Разам з тым, зазначаюць у Дзяржаўным мытным камітэце, лібералізацыя ні ў якім разе не азначае паслаблення кантролю. Сёлета мытнікі выявілі 6074 адміністрацыйныя правапарушэнні, заведзены 22 крымінальныя справы, з незаконнага абароту выведзеныя тавары і каштоўнасці на агульную суму 23,8 млрд. рублёў. Пры гэтым у ДМК адзначаюць: зараз назіраецца значнае (больш чым у 13 разоў адносна аналагічнага перыяду летась) павелічэнне аб'ёмаў кантрабанды ў краіну тытунёвых вырабаў — сёлета затрымана больш за 10 млн. «безакцызных» цыгарэт. З іншага боку, пачасціліся выпадкі «незадэклараванага» вывазу за мяжу наяўнай замежнай валюты — на суму больш за 3 млрд. рублёў у эквіваленце.

**Сяргей ГРЫБ.**

# Толькі іх дзеці?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Дарэчы, наконт грошай у райвыканкаме. Напэўна, іх сапраўды няма. Для нас. Аднак бачна, што на рамонт у будынку адміністрацыі яны знаходзяцца, — з горыччу дадала Алена Новік.

«Звязда» спытала ў маці-выхавальніцы, ці забяспечыў райвыканкам ёй і яе мужу адпачынак у гэтым годзе. Нагадаем, Палажэннем аб Дзіцячым доме сямейнага тыпу прадугледжана, што працоўны водпуск прыёмным бацькам даецца згодна з графікам працоўных водпускаў, які складае ўпраўленне адукацыі мясцовага выканкама. На час водпуску органы апекі і папячыцельства павінны арганізаваць летні адпачынак прыёмных дзяцей. У сапраўднасці, Новікі, і не яны адны, за шэсць гадоў працы прыёмнымі бацькамі (з 2002 года) ні разу не былі ў адпачынку. Бо за ўвесь гэты час у іх не было ніводнага месяца, калі б у іх доме не заставаліся прыёмныя дзеці.

У адказе «Звяздзе» ўпраўленне адукацыі Смаргонскага райвыканкама пазначае, што яно «штогод дае пуцёўкі дзецям Новікаў у санаторыі, аздараўленчыя лагеры, санаторныя школы і забяспечвае аздараўленне дзяцей за мяжой».

«Толькі ў 2008 годзе трое дзяцей правялі зімовыя і летнія канікулы ў Італіі. Былі выдзеленыя тры пуцёўкі ў круглasутачны аздараўленчы лагер для малодшых школьнікаў, 5 пуцёвак у летні лагер «Арляня». З малодшай гадаванкай Алена Аляксандраўна адпачывала ў санаторыі «Сасновы бор», — сказана ў лісце.

Усё гэта так. Аднак «Звязда» высветліла, хто з прыёмных дзяцей знаходзіўся дома на працягу лета 2008 года. З 1 па 12 чэрвеня дома трое дзяцей ва ўзросце з 2 да 15 гадоў; з 12 па 28 чэрвеня — пяцёра, з 28 па 30 — шасцёра, увесь ліпень і па 5 жніўня — пяцёра, з 5 па 18 жніўня — 2 дзяцей (тата ў гэты час працуе суткі праз суткі на жніве); з 18 па 22 жніўня (толькі тры дні!) у доме — адно прыёмнае дзіця — двухгадовая дзяўчынка, ужо з 22-га — чацвёра, з 24-га — сямёра, з 28-га — 10 дзяцей. Усё, лета скончылася. Шасцёра школьнікаў, чацвёра малых у доме (у кастрычніку Новікі чатырох малодшых дзяўчынак удачарылі). Пры гэтым Новікаў дзяржчыноўнікі ўсіх узроўняў, ад выканкама да міністэрства, папракаюць тым, што яны не пажадалі скарыстацца водпускам і просяць грашовую кампенсацыю. Што ж, у кампенсацыі ім адмоўлена, і Алена ў снежні пайшла-такі ў водпуск, які быў такім толькі на паперы. Бо хоць на зімовыя канікулы нехта з дзяцей і паехаў у Італію, аднак адпачыць у маці-выхавальніцы магчымасці не было — астатнія ж былі дома.

Наконт санаторыя. Алена Новік сапраўды ездзіла туды з адной са сваіх гадаванцаў. Гэтай дзяўчынцы патрабуецца суправаджэнне дарослага. І маці-выхавальніца, дзеля яе аздараўлення, вымушана пакідаць мужа сам-насам з астатнімі дзецьмі на тры тыдні. Ніякай дапамогі па гаспадарцы, ніякай даплаты за, па сутнасці, сумяшчэнне пасад і выкананне абавязацельстваў работніка, які часова адсутнічае, Мікалай Новік пры гэтым не атрымлівае. Яму, праўда, прапануюць на гэты час перадаць дзяцей у іншы дзіцячы дом, аднак гэтага не хочуць дзеці, а для Новікаў, у адрозненне ад рознага роду органаў, інтарэсы дзяцей — матэрыя рэальная, а не віртуальная. Яны ведаюць цану раўнавагі ў такой вялікай і няпростай сям'і.

Выходзіць, што бацькі-выхавальнікі ў нас — асобная катэгорыя работнікаў. З імі заключаюць працоўны дагавор, ім плацяць заробак як любому нанятаму работніку. Іх кантралююць і ад іх патрабуюць выканання працоўных абавязкаў, справаздач аб выкарыстанні грашовых выплат на ўтрыманне дзяцей. Аднак параўноўваць іх з іншымі, як бачыце, нельга. Многае ў іх жыцці існуе, пакуль, толькі на паперы. Праўда, наконт сёлетняга лета Алена Новік сказала, што на гэты раз быў складзены графік іх водпускаў і, магчыма, цяпер будзе ўсё інакш. Што ж, можа, цяпер, калі чатырох дзяцей Новікі ўдачарылі, выканкаму лягчэй будзе забяспечыць шэсць прыёмных дзяцей пуцёўкамі і наладзіць іх аздараўленне за мяжой у адзін і той жа час?

Аднак вернемся да матэрыяльнага забеспячэння дзіцячага дома сям'і Новікаў. Пасля размовы з бацькамі-выхавальнікамі «Звязда» пазваніла начальніку ўпраўлення адукацыі Смаргонскага райвыканкама Валерыю Бацько. Размовы не атрымалася. Валерый Уладзіміравіч спачатку зусім адмаўляўся адказваць на простае пытанне, потым усё ж такі прызнаўся, што сапраўды, выканкам запланаваў 2,5 мільёна рублёў на пакупку мэблі для дзіцячага дома Новікаў, але грошай гэтых няма. Вось і ўся размова.

Сёння вельмі зручны час. Такое ў нас ўжо было. Свежыя яшчэ ў памяці спасылкі на адсутнасць фінансавання і тлумачэнне гэтым многіх хібаў у самых розных сферах нашага жыцця. Цяпер таксама, калі што: «Самі разумееце, — крызіс, новыя эканамічныя ўмовы, эканомія сродкаў...» Калі б яшчэ дзеці маглі пачакаць, не расці, залегчы ў спячку да канца крызісу, каб нічога не патрабаваць, не зношваць, не вырастаць, не псаваць, не ламаць, не прасіць, не хацець, не марыць.

Новікі між тым за свой кошт робяць рамонт у гасцёўні, памянялі батарэі, падшылі столь. Яны яшчэ аказаліся павінны пенсійнаму фонду 2,5 мільёна рублёў, бо ім няправільна налічвалі пенсію на дзяцей: сто працэнтаў замест 50. Дарэчы, 50 працэнтаў пенсіі па страце карміцеляў выплачваецца дзецям, якія выхоўваюцца ў дзіцячых дамах сямейнага тыпу, якраз з-за таго, што матэрыяльна гэтыя дзеці павінны забяспечвацца лепш, чым дзеці з прыёмных сем'яў. Размова ідзе пра той самы 45-ы пункт Палажэння аб дзіцячым доме, які Смаргонскі выканкам не выконвае ў дачыненні да Новікаў. Памылку ў налічэнні пенсіі, дарэчы, высветлілі самі Новікі. Цяпер вырашаецца пытанне, як ім гэтыя грошы вяртаць. У выканкама не знайшлося якраз такой сумы для гэтых жа дзяцей...

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## Абзац

■ Візавы рэжым паміж Беларуссю і Ізраілем плануецца адмяніць у 2010 годзе, паведаміў на прэс-канферэнцыі ў Мінску Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Дзяржавы Ізраіль у Беларусі Эдуард Шапіра. Спачатку плануецца адмяніць узнос за візу, а потым і сам візавы рэжым. Сёння віза ў Ізраіль для беларусаў каштуе $17, а для ізраільцян у Беларусь — $100.

■ **Брэсцкі абласны суд прыгаварыў учора да пажыццёвага заключэння жыхара Камянецкага раёна, які летась у лістападзе забіў з асаблівай жорсткасцю дзвюх жыхарак Брэста — 52-гадовую жанчыну і яе дачку 1990 г.н. 36-гадовы забойца быў неаднаразова судзімы, у т.л. за наўмыснае забойства таксіста ў групе з мэтай завалодання аўтамабілем.**

■ Незвычайны хлеб «Лельчэцкі», начынены салам і часнаком, выпякаюць на камбінаце кааператыўнай прамысловасці Пастаўскага райпа (Віцебская вобл.), расказала дырэктар камбіната Людміла Касцюкова. Эксклюзіўны рэцэпт «тры ў адной буханцы» распрацаваны тэхнолагамі прадпрыемства, і яго ўжо ўпадабалі пакупнікі не толькі ў Паставах, але і ў суседніх раёнах вобласці. У ржаное цеста дадаюцца кавалачкі сала, затым усё запраўляецца часнаком і выпякаецца, як звычайная буханка хлеба.

■ **За адны суткі ў Беларусі адбылося 76 пажараў у прыродных экасістэмах. Агульная іх плошча склала 40 га. Найбольшая колькасць узгаранняў — у Брэсцкай, Гомельскай і Мінскай абласцях. З пачатку года ад травяных пажараў загінула 5 чалавек.**

## Поўны абзац



■ Улады прымусілі жыхарку Брытаніі апрануць голых садовых гномаў. Фігуры гномаў — адна мужчынскага полу і дзве жанчыны з рэльефнымі формамі — стаяць каля дома 64-гадовай Сандры Сміт на працягу 15 гадоў. Яны дадаюць настрою гасцям, да ўсяго, па словах Сандры, вельмі падабаюцца яе ўнукам. На жанчыну паскардзілася суседка, якая лічыць, што паставы голых гномаў дрэнна ўздзейнічаюць на яе дзяцей. Суседка заявіла, што голым гномам не месца ў садзе. Сандры пазванілі з мясцовай адміністрацыі і папярэдзілі аб тым, што гномаў неабходна апрануць, таму што іх выгляд зняважлівы.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

## БРАТЫ-ФАЛЬСІФІКАТАРЫ

**Два браты з Івацэвічаў, якія арганізавалі свой «цэх» па разліве хадавога тавару ў горадзе па месцы жыхарства аднаго з іх, шукалі шляхі для рэалізацыі «самапалу» ў Мінску.**

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, 27- і 29-гадовыя «бізнэсмены» «асвоілі» падпольны выпуск фальсіфікаванай гарэлкі «Пшанічная хвіля» і «Сталічная» пад гандлёвай маркай «Палтаўскі лікёрагарэлачны завод». Са студзеня мінулага года і амаль да канца сакавіка гэтага яны разлівалі ў бутэлькі нехарчовы этылавы спірт, дадавалі туды ж спецыяльныя араматызатары, воцат і ваду. Тару, гатовую да рэалізацыі, «упрыгожвалі» фальшывымі этыкеткамі згаданага завода і падробнымі акцызнымі маркамі Украіны. Падчас правядзення вобыску ў іх было знойдзена і канфіскавана 295 бутэлек фальсіфікату... Братам паграджае пазбаўленне волі да трох гадоў.

**Ігар ГРЫШЫН.**


ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «НЕРУДПРОМ»,
КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ТЕХНИКИ:**

| № лота | Наименование и технические характеристики | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | Бульдозер ДЭТ-250 (в экспл. с 1988 г.) | 83 834 000 |
| 2 | Экскаватор МТП-71б (в экспл. с 1990 г.) | 31 714 500 |
| 3 | Экскаватор Э-2503 (в экспл. с 1970 г.) | 123 698 000 |
| 4 | Дробилка КМД-1200 (в экспл. с 1987 г.) | 142 156 337 |

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 14.11.2008 г. Аукцион состоится **05.05.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **04.05.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел:(8017) 224 61 34. Сайт в интернете (www.rlt.by).**



ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «СПЕЦИАЛИЗИРОВАННОЕ СТРОИТЕЛЬНО-МОНТАЖНОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ»,
КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже Мядельской производственной базы расположенной по адресу: г. Мядель, ул. Интернациональная, д. 27 в составе: законсервированное, незавершенное строительством здание конторы, об. пл. 113,1 кв.м, здание склада, об. пл. 90 кв.м, ограждение (в количестве 27 ж/б плит, 4х2 м), металлические ворота (4х1,5 м). Начальная цена с НДС – 96 370 600 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,3715 га. Задаток в размере 10 % от начальной цены лота перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 календарных дней со дня проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **26.05.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.05.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел: (8017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.**



**КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»**

**проводит открытый аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в Минском районе:**

| | Лот 1 | Лот 2 | Лот 3 | Лот 4 | Лот 5 |
|---|---|---|---|---|---|
| Адрес земельного участка | Минский район, г.п. Мачулищи | Минский район, г.п. Мачулищи | Минский район, г. Заславль | Минский район, п. Колодищи | Минский район, п. Ратомка |
| Кадастровый номер | 623655500001000304 | 623655500001000303 | 623650100001003699 | 623683403101005890 | 623681708601002213 |
| Площадь земельного участка | 0,3001 га | 0,5004 га | 0,5934 га | 0,1006 га | 0,8501 га |
| Срок аренды | 51 год | 51 год | 51 год | 30 лет | 40 лет |
| Целевое назначение | для строительства производственной базы | для строительства производственно-складских и технических сооружений для производства изделий медицинского назначения | для строительства объектов придорожного сервиса между автодорог Р-28 Минск-Молодечно-Нарочь и Р-65 Заславль-Дзержинск-Озеро, южнее АЗС № 29 РУП «Белоруснефть-Минскавтозаправка» | для строительства кафе-магазина | для строительства физкультурно-оздоровительного комплекса |
| Сумма потерь с/х производства (рублей) | — | 8 487 405 | — | 3 720 209 | — |
| Расходы по подготовке документации (рублей) | 2 883 467 | 1 827 820 | 1 033 978 | 1 114 223 | 2 151 045 |
| Начальная цена права заключения договора аренды (долларов США) | 41 150,19 | 35 851,36 | 13 756,32 | 20 619,98 | 33 676,20 |
| Задаток (рублей) | 11 650 000 | 10 150 000 | 3 890 000 | 5 840 000 | 9 540 000 |

Задаток перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить потери сельскохозяйственного производства, вызванные изъятием сельскохозяйственных земель для использования в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства и расходы, оговоренные в условиях проведения аукциона. Договор аренды земельного участка заключается с победителем аукциона в течение 2-х рабочих дней после внесения им всех причитающихся платежей. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками. Аукцион состоится **26.05.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.05.2009 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 324.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.**

УНП 690324015


БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК

ТРАДИЦИИ НАДЕЖНОСТЬ КОМПЕТЕНТНОСТЬ

Наименование банка:

**ОАО «БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК»**

*г. Минск, ул. Мясникова, 32*

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2009 года**

*(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 01.04.09 | на 01.04.08 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 60408,9 | 50710,8 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 138687,7 | 64377,1 |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | 4597,2 | 21247,3 |
| | для торговли | 11031 | — | — |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | 4597,2 | 10014,6 |
| | в наличии для продажи | 11033 | — | 11232,7 |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 237708,2 | 48291,2 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 1285241,3 | 904217,6 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 3409,0 | 3399,9 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 77844,7 | 64379,5 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 16799,3 | 13918,0 |
| 10 | ИТОГО активы | 110 | 1824696,3 | 1170541,4 |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 627,4 | 7388,6 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 408162,6 | 326165,6 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 936614,3 | 700835,7 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | 1804,6 | 1725,2 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 31553,9 | 19859,9 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | 1378762,8 | 1055975,0 |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 327483,0 | 24122,1 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | — | — |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | 20879,1 | 13173,2 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 43152,1 | 33666,1 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 54419,3 | 43605,2 |
| 24 | Всего капитал | 121 | 445933,5 | 114566,4 |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 1824696,3 | 1170541,4 |
| 26 | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 578625,7 | 377576,6 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 444936,6 | 377736,6 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2009 года**

*(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 01.04.09 | на 01.04.08 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 44399,8 | 23899,1 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 23386,8 | 12878,7 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 21013,0 | 11020,4 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 12165,9 | 10896,0 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 1988,8 | 1464,5 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 10177,1 | 9431,5 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 10309,0 | 2675,9 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 33,1 | -2,3 |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | 5,1 | 16,7 |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 3208,9 | -155,1 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 10182,6 | 1238,9 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 24950,7 | 16703,1 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 7757,2 | 1896,5 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | 4691,8 | 1804,9 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ ( УБЫТОК) | 2 | 11111,3 | 4131,7 |

**Председатель Правления** **Г.А. Егоров**

**Главный бухгалтер** **З.С. Кушнерова**

*Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 6 от 27.10.2006. УНП 100010078.*

## НЕ КУРЫЦЕ, ЖАНЧЫНЫ...

Толькі абгарэлы зруб застаўся ад дома 42-гадовай жыхаркі вёскі Губічы Буда-Кашалёўскага раёна, якая курыла ў сваёй хаце сярод белага дня. Агонь імгненна ахапіў і хлеў. Для 21-гадовай непрацуючай жанчыны з вёскі Ламавічы Акцябрскага раёна выкураная на канапе цыгарэта стала апошняй пасля распіцця спіртнога з сяброўкай у доме свайго сужыцеля. 68-гадовая гамяльчанка, што перажыла інсульт, як толькі крыху ачуняла, вырашыла таксама пакурыць у ложку. Пры гэтым сталая жанчына атрымала цяжкі апёк абедзвюх ног. За яе жыццё некалькі дзён змагаліся ўрачы, але ж безвынікова...

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Дыскусійная трыбуна

# Аляксандр ПАТУПА: «БІЗНЭСУ — ДВА ЎЗРОЎНІ АБАРОНЫ»

## Базавымі пазіцыямі ў стартавым пакеце лібералізацыі павінны стаць: гарантыі, абгрунтаванні, кансультацыі, сістэмная расчыстка адміністрацыйных бар'ераў

**Другое пасяджэнне Грамадска-кансультацыйнага савета пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі запланавана на 24 красавіка. Напярэдадні гэтай падзеі мы папрасілі Аляксандра Патупу, ганаровага старшыню Беларускага саюза прадпрымальнікаў, члена Грамадска-кансультацыйнага савета падзяліцца праблемамі, якія ён плануе абмяркоўваць на пасяджэнні.**

— У мяне ёсць прапановы, папершае, непасрэдна па тэматыцы пасяджэння — гэта прапановы па правядзенні лібералізацыі і па супрацьстаянні крызісным з'явам. І па-другое, шэраг прапаноў па працы самога савета. Напрыклад, прапаную разабрацца, што ставіцца на галасаванне на пасяджэнні: калі толькі пытанні вядзення пасяджэння, то ўсё ў парадку. А калі пытанне аб прыняцці або непрыняцці канкрэтнага праекта — то такі падыход няправільны. Бо менавіта каштоўныя заўвагі і дадаткі астатніх членаў савета або іх альтэрнатыўныя праекты дазваляюць сфарміраваць найбольш поўны пакет для разгляду ў адпаведных інстанцыях. Ну, і яшчэ я прапаную запрашаць на пасяджэнне Грамадска-кансультацыйнага савета прадстаўнікоў Саўміна і Мінэканомікі для абмеркавання нашых прапаноў, а таксама больш шырокае кола прадстаўнікоў СМІ, бо першае пасяджэнне паказала, што да дзейнасці савета праяўляецца вялікая цікавасць, асабліва ў недзяржаўных СМІ.

***— Аляксандр Сяргеевіч, а якой Вы бачыце асноўную задачу Грамадска-кансультацыйнага савета?***

— На цяперашнім этапе — стварэнне дыялогавай экспертнай сеткі. У эканамічнай сферы павінна з'явіцца Міжведамасная камісія па эканамічных рэформах, якая займалася б працэсам сістэмнай лібералізацыі, выпрацоўвала б неабходныя захады па адаптацыі да крызіснай сітуацыі, абмяркоўвала найбольш важныя нарматыўныя акты ў эканамічнай галіне. Яна б магла выконваць ролю каардынатара для ўжо дзейных груп і саветаў (па падатковай сістэме, па штрафах і санкцыях, па адміністрацыйных працэдурах, па ўдасканальванні працоўнага заканадаўства) і для яшчэ планаваных (па эканамічных праблемах аховы здароўя, адукацыі, высокіх тэхналогіяў). Такія камісіі былі б каштоўнымі і ў галіне правоў чалавека, выбарчага заканадаўства. Я лічу, што стварэнне гэтых камісій было б найбольш моцнай дэманстрацыяй пазітыўных намераў улады весці дыялог з недзяржаўнымі экспертамі. А галоўнае, зразумела, не ў прыгожым афармленні, а ў сутнасці распачатых працэсаў.

***— Як, на Ваш погляд, павінен праходзіць працэс сістэмнай лібералізацыі?***

— Я мяркую, што базавымі пазіцыямі ў стартавым пакеце лібералізацыі павінны стаць: гарантыі, абгрунтаванні, кансультацыі, сістэмная расчыстка адміністрацыйных бар'ераў. Лічу, што агульны пераход эканомікі на рынкавую фазу і падтрымка прадпрымальніцтва павінны быць абазначаны Дырэктывай Прэзідэнта, а новы ўзровень гарантый — зададзены адпаведным Дэкрэтам Прэзідэнта, які потым дэталізуецца ў Законе аб развіцці прадпрымальніцтва ў Беларусі. Дырэктыва павінна ў цэлым акрэсліць павышэнне ўзроўню абгрунтавання нарматыўных актаў, а таксама неабходнасць сістэматычных кансультацый з бізнэс-асацыяцыямі і недзяржаўнымі даследчымі структурамі. Безумоўна, было б мэтазгодна аформіць дакументы прамога дзеяння, напрыклад, Указ аб стандарце абгрунтавання нарматыўных прававых актаў, каб усе праекты нарматыўных прававых актаў абмяркоўваліся або на Грамадска-кансультацыйным савеце, або вядучымі бізнэс-асацыяцыямі яшчэ да іх прыняцця. Я лічу, што ўсе праекты нарматыўных актаў павінны разглядацца па прынцыпе «няма абгрунтавання — няма працэдуры!». Гэта дазволіць істотна павысіць каэфіцыент каштоўнага дзеяння працы па фарміраванні і аптымізацыі рынкава арыентаванай прававой дзяржавы.

***— Якую вы можаце прапанаваць антыкрызісную стратэгію для краіны?***

— Трэба разумець, што Беларусь трапіла ў поле крызісных працэсаў, якія на паўтара-два парадкі перавышаюць нашы эканамічныя магчымасці. Таму нам трэба сканцэнтравацца на адаптацыі да наяўных умоваў (у тым ліку і экспарта-імпартных), на мінімізацыі стратаў і на падрыхтоўцы краіны да посткрызіснага развіцця. Скажам, апісаная вышэй сістэмная лібералізацыя накіравана на павышэнне інвестыцыйнай прывабнасці краіны зараз і на перспектыву. А новы ўзровень такой прывабнасці і адкрывае шлях да стварэння рэальнага фондавага рынку. Зараз, я лічу, важна правесці комплексы мераў па мінімізацыі стратаў і паляпшэнні эканамічных магчымасцяў у будучыні. Прынамсі, для падрыхтоўкі сур'ёзнай прыватызацыі неабходна правесці поўную «холдынгізацыю», гэта значыць перадачу кіравання дзяржаўнай маёмасцю спецыяльным дзяржаўным холдынгам, карпарыцыям або агенцтвам. І тады міністэрствы і ведамствы змогуць засяродзіцца па праблемах эканамічнай палітыкі і рэальна ажыццяўляць канстытуцыйнае палажэнне аб роўнасці ўсіх формаў уласнасці. Паралельна трэба акуратна перагледзець і сацыяльную праекцыю прыватызацыі, у рамках чаго давесці дапамогу па беспрацоўі да нармальнага ўзроўню. Неабходна неадкладнае стымуляванне малога бізнэсу да стварэння дадатковых працоўных месцаў — гэта будзе цывілізаванай альтэрнатывай скарачэнню колькасці працоўных месцаў на буйных і сярэдніх прадпрыемствах. Хацеў бы яшчэ адзначыць ролю PR у часы крызісу. З улікам таго, што крызіс у значнай ступені праблема сацыяпсіхалагічная, людзей трэба інфармацыйна падтрымліваць у спробах лакальна супрацьстаяць крызісным стратам, у пошуках новых шляхоў прымянення ўласнай актыўнасці. І, нарэшце, варта памятаць, што посткрызісны свет будзе трошкі іншым. Ёсць падставы лічыць, што будучы рывок у росце сусветнай эканомікі будзе звязаны з нана- і біятэхналогіямі, што заўважна зменіцца структура экспартна-імпартных патокаў. То бок мы павінны гэтыя змены прадбачыць і стымуляваць працы ў галіне высокіх тэхналогій і падрыхтоўцы якасна новых прадуктаў і паслуг.

***— А што вы думаеце наконт праграм і платформаў іншых людзей ці аб'яднанняў?***

— Я хацеў бы пазбегнуць прамой крытыкі, бо з павагай стаўлюся да зробленай працы. Там шмат важных і перспектыўных думак. Скажу толькі, што я скептычна стаўлюся да патрабаванняў, складзеных у дэкларатыўна-лозунгавай форме. На мой погляд, для любых ідэй трэба ствараць дыялогавыя пляцоўкі, бо камандныя прадпісанні ніколі не ажыццяўяцца. І зразумела, метадалагічная аснова дыялога павінна быць нармальнай, якая б забяспечвала высокі каэфіцыент каштоўнага дзеяння.

***— Якім бы вы хацелі бачыць інвестыцыйны клімат у краіне?***

— Мне хацелася б, каб варыянты абмежавання правоў і экспрапрыяцыі былі абгрунтаваны на судова-следчым узроўні, каб спробы пагоршыць умовы вядзення бізнэсу натыкаліся на два ўзроўні абароны — гэта патрабаванне ад чыноўнікаў сур'ёзнага абгрунтавання новых нарматыўных актаў і зменаў у заканадаўстве, а таксама іх экспертыза ў бізнэс-асацыяцыях. Каб праводзілася сістэматычная, інтэнсіўная праца ўрада разам з бізнэс-асацыяцыямі па «зачыстцы» прававой прасторы ад неабгрунтаваных абмежаванняў і канфіскацый, каб нармалізаваліся падатковая і працэдурная нагрузкі, каб адсутнічаў так званы «белы рэкет», калі выцягваюцца грошы на «сацыяльна значныя мэты». І, нарэшце, каб не было небяспекі знешняй блакады, для чаго паміж уладай і недзяржаўнымі экспертамі павінны існаваць дыялогавыя пляцоўкі па правах чалавека і па ўдасканаленні выбарчай сістэмы. На жаль, калі, напрыклад, замежны інвестар папросіць ацаніць інвестыцыйную сітуацыю ў краіне, то ні адзін добрасумленны эксперт зараз не дасць цалкам станоўчага заключэння. Мне б вельмі хацелася, каб гэтая сітуацыя радыкальна змянілася.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

# ВЫБЕГ ВОЖЫК НА ДАРОГУ...

**Кожная жывая істота, створаная Прыродай, мае права на жыццё. Закон вызначаны не чалавекам, але апошні часта ўносіць сваю карэкціроўку і бачыць у навакольным асяроддзі найперш сябе.**


Каўбаса смачная.

Прыехаў на дачу і каля ядлоўца ўбачыў вожыка, які, прыўзняўшы мордачку, прынюхваўся. Хоць гэты звярок выходзіць на паляванне ноччу, але пасля зімовай спячкі моцна схуднеў і тут выбіраць не выпадала — вырашыў падсілкавацца днём. Ад кавалачка каўбасы ён не адмовіўся. Спакойна з'еў і падаўся ў леташні сухастой.

Да вожыкаў у нас ставяцца прыхільна, хоць у дзяцінстве даводзілася бачыць, як звяркоў забівалі — іх тлушч ужывалі хворыя на сухоты, з яго рабілі розныя мазі для націрання. Не ведаю пры якіх хваробах іх выкарыстоўвалі, але людзі тым тлушчам лячыліся.

Калі на вашым агародзе з'явіўся вожык, то там не будзе не толькі грызуноў, але і слізнякоў, бо гэты звярок — дужа пражэрлівая істота. Як толькі апускаюцца прыцемкі, вожык пачынае абшукваць сваю тэрыторыю — абшнарыць кожны куток, прасуне лычык ва ўсякую шчылінку.

Вожык лёгка прывыкае да чалавека, але ад яго і гіне. І хоць робіцца гэта ненаўмысна, тым не меней шкода Прыродзе наносіцца вялікая.

Калі ехаць ад Баранавічаў да Палонкі — вёскі сярод лесу, то можна бачыць, колькі вожыкаў кожны год гіне пад коламі аўтамашын. Дзясяткі — гэта толькі на адной дарозе. Лес ці купкі дрэў абапал асфальту, а звяркі імкнуцца перабегчы... Магчыма, нехта і прытармозіць, але гэта будзе ўсё ж выключэнне, а ў лепшым выпадку вадзіцель ці пасажыры толькі пракаменгуюць наезд на калючага.

Мілае стварэнне гэты вожык, але ж цiснуць на тармазы, калі ён выбягае на дарогу, — гэта не панашаму.

Вось у Швецыі перад жабай, якая выпаўзла на дарогу, аўтамашыны спыняюцца — перанясуць на абочыну ці чакаюць, пакуль перапаўзе. У краінах Скандынавіі існуе закон, паводле якога забараняецца абразаць сабакам вушы і хвасты. Якімі іх Прырода стварыла — такімі і павінны быць, без усякай купіроўкі, бо там лічаць, што нельга дзеля моды і вычварнасці здзекавацца над жывёлай.

Кожную вясну даводзіцца бачыць адну і тую карціну. Дарога да маёй дачы пралягае праз невялікае балотца. Павярнуў за Крошынам направа, а там дарога нізінкай — метраў сто. Як толькі прыгрэе сонца, на асфальт выпаўзаюць з балота жабы. Пасля зімы ім абавязкова трэба добра прагрэцца — яны, як акумулятары, назапашваюць цяпло, а асфальт лепш на сонцы награецца.

Перажылі квакухі зіму, дачакаліся вясны і... сваёй смерці. І тут нават успамінаецца байка К. Крапівы пра жабоцьку, якая залезла ў каляіну, каб перакуліць савецкі воз, а ў выніку «хрась». Дык вось тыя сто метраў асфальту суцэльны «хрась».

Еду, а перад машынай на веласіпедзе падлетак круціць рулём то ўправа, то ўлева — па жабах стараецца праехаць. А тыя не варушацца — сонцу радуюцца.

Праўду кажучы і я быў у дзяцінстве такім жа. Але ж у той час, калі коні ад голаду віселі ў калгаснай стайні на вяроўках і калі дзеці бачылі, як забіваюць схуднелых коней на корм свінням, то што такое было стукнуць палкай жабу?

Сумна, што за паўвека ў паводзінах дзяцей нічога не змянілася, а можа, гэта толькі здаецца?

На тым участку дарогі можна было б паставіць знак абмежавання хуткасці — на нейкі тыдзень. Але ж мы не скандынавы.

Побач з санаторыем «Магістральны» ў Баранавічах знаходзіцца сярэдняя школа № 15. Каб трапіць у яе, неабходна перайсці аўтамагістраль. Ніякіх знакаў і пераходу на дарозе не было, і толькі калі пад грузавік трапіў першакласнік, паставілі ўсе знакі і нават паклалі «паліцэйскага». А я кажу пра нейкіх жабаў...

Справа не ў тым, каб з замілаваннем глядзець на кожнага камарыка (хоць калі тыя камары цёплым вечарам «таўкуць кашу», то гэта не толькі хораша, але і знак таго, што жыццё працягваецца), а ў тым, што грамадства не можа развівацца гарманічна пры абыякавасці да Прыроды.

Хутка змяніць тут нічога немагчыма, але задумацца трэба — усе мы плывём на адным караблі.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**
**Фота аўтара.**

## «Адзначылі» і селі за руль

**За мінулыя выхадныя адбыліся 53 дарожна-транспартныя здарэнні, у якіх 9 чалавек загінулі і 61 быў паранены. 669 вадзіцеляў затрыманы ў стане алкагольнага ап'янення. Пацярпелі і 8 дзяцей.**

Так, у Магілёве 20-гадовы вадзіцель не справіўся з кіраваннем, выехаў на ўзбочыну, дзе наехаў на дзвюх дзяўчынак — 9 і 12 гадоў. Дзяўчынкі атрымалі сур'ёзныя траўмы і былі шпіталізаваныя: адна — з траўмай галавы і пераломам нагі, другая — з пераломам нагі. За тры месяцы з удзелам дзяцей адбылося 99 дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх 4 дзіцяці загінулі і 95 былі паранены. «Паважаныя бацькі, штодня нагадвайце сваім дзецям правілы дарожнага руху і бяспечных паводзінаў паблізу дарог, — кажа старшы інспектар спецыяльнага падраздзялення ДПС «Страла» Міністэрства ўнутраных спраў. — На канкрэтных прыкладах тлумачце, як правільна рэагаваць на небяспеку. Вучыце дзяцей быць уважлівымі і асцярожнымі, прымацоўвайце да адзення значкі і падвескі з матэрыялу, які адбівае святло».

Дзяржаўтаінспекцыя таксама нагадвае, што кіраванне транспартным сродкам асобай, якая не мае права кіравання, гэтаксама як і перадача кіравання асобе, якая не мае права кіравання, караецца штрафам у памеры ад 175 да 700 тысяч рублёў. За тры месяцы па віне вадзіцеляў, якія не маюць правоў на кіраванне транспартным сродкам, было здзейснена 76 дарожна-транспартных здарэнняў, прычым 29 з іх — у стане алкагольнага ап'янення. У гэтых здарэннях загінула 13 чалавек, 93 былі паранены.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Крымінальнік хаваўся ў Дрэздэне

**Расіянін, які ў 1995 годзе ўчыніў у Беларусі два цяжкія злачынствы, а пасля хаваўся за мяжой, экстрадыраваны ў краіну.**

Паводле звестак упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, абвінавачваецца гэты грамадзянін 1974 года нараджэння ва ўчыненні двух забойстваў, а ахвярамі яго сталі аўтаўладальнікі. Так, летам 1995 года на аўтарынку ў Гродне ён дамовіўся з мясцовым жыхаром аб набыцці аўтамабіля «БМВ-318» і пад выглядам праверкі хадавых якасцяў машыны выманіў яго за горад. Там, каб завалодаць аўтамабілем, злачынца стрэлам у галаву з пісталета забіў гродзенца, выкінуў цела ў лесе, а «БМВ» па падробленых дакументах прадаў у Іошкар-Але. Сюды ж ён прыгнаў і «Аўдзі-200» з Магілёўскай вобласці, з гаспадаром якой расправіўся ў снежні 1995 года, як і ў першым выпадку.

Зніклы крымінальнік быў аб'яўлены ў міжнародны вышук па лініі Інтэрпала ў 1996 годзе. А затрымалі яго леташнім сакавіком у Дрэздэне. Зараз нямецкі бок задаволіў хадатайніцтва Генпракуратуры Беларусі аб выдачы абвінавачванага.

**Ігар ГРЫШЫН.**

# 36,6° СКРЫНІНГ РАКУ

**Прыведзеныя тэсты прымяняюцца пры скрынінгу раку і з'яўляюцца часткай праграмы па папярэджванні раку, распрацаванай Амерыканскім супрацьракавым таварыствам.**

### Рак малочнай залозы

Трывожныя прыкметы: выяўленыя на мамаграме анамаліі, любыя ўшчыльненні ў грудзях, крывацёк ці выдзяленні з саска.

**Фактары рызыкі:**
- жанчыны ва ўзросце пасля 50 гадоў
- жанчыны, якія не раджалі
- нараджэнне першага дзіцяці пасля 30 гадоў
- адсутнасць груднога выкормлівання
- калі ідэальная вага цела больш як на 40 працэнтаў
- ранняя палавая сталасць або позняя менапаўза
- з сямейнай гісторыяй раку малочнай залозы да менапаўзы, раку абедзвюх малочных залоз ці раку яечнікаў.

Рэкамендацыі: кожнай жанчыне рэкамендуецца раз у месяц дасканала праверыць сваю малочную залозу, а жанчынам ва ўзросце 20-39 гадоў праверыцца ў ўрача раз у 3 гады. Не ўсе медыкі аднадушныя ў тым, як часта жанчына павінна праходзіць мамаграфію, і вынікі даследаванняў па высвятленні карысці штогадовых мамаграфічных праверак супярэчлівыя. Адны спецыялісты рэкамендуюць штогод праводзіць праверку стану грудзей урачом і мамаграфію ў жанчын пасля 40 гадоў. Некаторыя ўрачы лічаць больш падыходзячым для такіх праверак узрост пасля 50 гадоў. Прыняць рашэнне можна разам з урачом на падставе індывідуальных звестак.

### Рак шыйкі маткі

Трывожныя прыкметы: ненармальны крывацёк з похвы.

**Фактары рызыкі:**
- генітальны герпес або генітальныя бародаўкі
- пачатак палавога жыцця хутка пасля палавога выспявання
- мноства палавых партнёраў
- курэнне

Рэкамендацыі: жанчынам, якія вядуць актыўнае палавое жыццё, рэкамендуецца штогод праходзіць агляд у гінеколага і рабіць пап-тэст (мазок па Папанікалаў, які бярэцца падчас гінекалагічнага агляду).

### Рак тоўстай і прамой кішкі

Трывожныя сімптомы: кішэчны крывацёк або працяглае змяненне характару работы кішэчніка.

**Фактары рызыкі:**
- наяўнасць паліпаў у кішэчніку
- сямейная гісторыя захворванняў на рак тоўстай і прамой кішкі або запаленчых захворванняў кішэчніка
- курэнне
- малая фізічная актыўнасць
- дыета з высокім утрыманнем тлушчу
- дыета з нізкім утрыманнем клятчаткі
- дыета, бедная на фрукты і гародніну
- ужыванне алкаголю

Рэкамендацыі: пасля 50 гадоў (сярэдні ўзрост праявы гэтай формы раку) рэкамендуецца праходзіць адну ці некалькі наступных працэдур:
— штогадовы аналіз стула на наяўнасць схаванай крыві
— сігмаідаскапію раз у 5 гадоў
— ірыгаскапію кожныя 5 гадоў
— каланаскапію кожныя 10 гадоў.

### Рак эндаметрыя

Трывожныя сімптомы: анамальны крывацёк з похвы.

**Фактары рызыкі:**
- бясплоднасць або адсутнасць авуляцыі
- позні надыход менапаўзы або працяглая тэрапія эстрагенамі ці выкарыстанне пасля менапаўзы тамаксіфена
- атлусценне
- дыябет
- захворванне жоўцевага пухіра
- павышаны артэрыяльны ціск
- спадчынны непаліпозны рак тоўстай кішкі

Рэкамендацыі: большасць выпадкаў раку эндаметрыя выяўляецца рана з-за крывацёку пасля менапаўзы. Калі ў сям'і былі выпадкі непаліпознага раку тоўстай кішкі, пасля 35 гадоў рэкамендуецца рабіць біёпсію эндаметрыя штогод.

### Рак лёгкіх

Трывожныя сімптомы: пастаянны кашаль, кроў у макроце, бранхіт, боль у грудзях і зваротная пнеўманія.

**Фактары рызыкі:**
- курэнне
- пасіўнае курэнне
- уздзеянне такіх рэчываў, як асбест ці мыш'як
- уздзеянне радону і абпраменьванне
- туберкулёз

Рэкамендацыі: калі вам за 40, рабіце рэнтгенаграфію груднай клеткі. На сёння вывучана магчымае прымяненне для ранняй дыягностыкі раку лёгкіх спіральнай камп'ютарнай тамаграфіі і выяўлення ў макроце малекулярных маркераў.

### Рак ротавай поласці

Трывожныя сімптомы: змяненне колеру слізістай ротавай поласці, ушчыльненне або патаўшчэнне ў роце або з'яўленне незагойных язвачак.

**Фактары рызыкі:**
- мужчынскі пол і ўзрост пасля 40 гадоў
- жаванне тытуню
- злоўжыванне алкаголем

Рэкамендацыі: калі ў вас з'явіліся названыя вышэй сімптомы, адразу звярніцеся да спецыяліста.

### Рак прастаты

Трывожныя сімптомы: часта адсутнічаюць. Бываюць складанасці з мочаспусканнем. Кроў у мачы або пастаянны боль у ніжняй частцы спіны, у тазе або верхняй частцы сцёгнаў.

**Фактары рызыкі:**
- узрост пасля 65 гадоў
- негроідная раса
- гэта захворванне ў сямейным анамнезе

Рэкамендацыі: калі вам за 40, рэкамендуецца пальцавае абследаванне прамой кішкі падчас штогадовых візітаў да ўрача. Пасля 50 гадоў (ці раней, калі ў сям'і былі выпадкі раку прастаты) рэкамендуецца рабіць аналіз крыві на прастатспецыфічны антыген. Гэты тэст многія спецыялісты лічаць не ідэальным, аднак на сёння ён лічыцца найлепшым метадам выяўлення раку прастаты.

### Рак скуры

Трывожныя сімптомы: невялікае паражэнне з няроўнымі краямі. Шчыльная шышка, вузельчык ці паражэнне ад светлага да чорнага колеру на любым участку скуры. Цёмныя паражэнні на далонях, падэшвах ці на канцах пальцаў рук або ног. Бліскучае, васкавіднае, перламутравае ўшчыльненне на твары, вушах ці шыі. Шчыльны чырвоны вузельчык або плоскае паражэнне з паверхняй, якая лупіцца ці пакрылася коркай. Змяненне памераў знака. Язва, якая не паддаецца лячэнню.

**Фактары рызыкі:**
- светлая скура
- блакітныя вочы
- рыжыя валасы
- моцныя сонечныя апёкі ў дзяцінстве
- сямейная распаўсюджанасць радзімых знакаў і радзімак
- уздзеянне вугалю, дзёгцю, смалы, крэазоту, злучэнняў мыш'яку або радыю

Рэкамендацыі: калі ў вас ёсць адно з пералічаных вышэй паражэнняў скуры, звярніцеся да спецыяліста.

### Рак яечак

Трывожныя сімптомы: любое ўшчыльненне яечка, змяненне яго памераў або адчуванне напружання.

**Фактары рызыкі:**
- рак яечкаў паражае маладых мужчын і рэдка сустракаецца пасля 40 гадоў. Вядомым фактарам рызыкі з'яўляецца неапушчэнне аднаго ці абодвух яечак пры нараджэнні.

Рэкамендацыі: пасля 20 гадоў штомесяц праводзіць самаагляд.

### Рак горла

Трывожныя сімптомы: асіпласць.

**Фактары рызыкі:**
- інтэнсіўнае курэнне, асабліва ў спалучэнні са злоўжываннем алкаголю.

Рэкамендацыі: калі вы шмат курыце або ў вас з'явілася асіпласць ці змяніўся голас і гэтыя змяненні працягваюцца больш за некалькі тыдняў, штогод праходзьце праверку стану горла.

### Рак мачавога пухіра

Трывожныя сімптомы: кроў у мачы, боль у спіне, страта вагі і апетыту, працяглае павышэнне тэмпературы і анемія.

**Фактары рызыкі:**
- мужчынскі пол ва ўзросце пасля 50 гадоў
- курэнне
- інфекцыі мочавыводзячых шляхоў у анамнезе

Рэкамендацыі: пры звычайным штогадовым аналізе мачы можа быць выяўлена кроў у мачы. Гэта — найбольш частая прыкмета захворвання.

**Падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Паляванне па-за законам

### КІНУЛІ КАЗУЛЮ ПАД АГАРОДЖАЙ

Пра незаконнае паляванне паблізу вёскі Ізін Пінскага раёна супрацоўнікам Пінскай міжрайінспекцыі паступіў сігнал. На месцы дзяржінспектары выявілі мікрааўтобус «Фальксваген-Транспарцёр». Падчас скрытага назірання яны ўстанавілі, што вадзіцель мікрааўтобуса і яшчэ два чалавекі накіраваліся ў вёску Жытнавічы і спыніліся побач з адным домам. Аднак, відавочна, назіранне было заўважана, бо машына «дала газу». Побач з агароджай дома, дзе спыняўся мікрааўтобус, была знойдзена туша казулі. Пра здарэнне паведамілі ў Пінскі РАУС і супрацоўнікі міліцыі перакрылі ўезд у горад. Уладальнік мікрааўтобуса быў устаноўлены. Узбуджана крымінальная справа.

### СПРАВА БЫЛА ПАД БАРТАЛАМЕЕЎКАЙ...

У Веткаўскім раёне супрацоўнікамі ўзвода міліцыі па ахове зонаў адчужэння і адсялення быў затрыманы аўтамабіль, у якім знаходзіліся мяхі з сеткамі, рыбай, гумавай лодкай, рыбацкім камбінезонам. Пяць чалавек былі дастаўлены ў міліцыю. Канфіскавана сем сетак агульнай даўжынёй 157 метраў і 29 кілаграмаў рыбы. Разглядаецца пытанне аб узбуджэнні крымінальнай справы.

### ДВАЙНЫ ХАБАР... ЗА ЛЯШЧОЎ

Супрацоўнікі Гомельскай аблінспекцыі сумесна з прадстаўнікамі Веткаўскай раённай арганізацыі таварыства паляўнічых і рыбаловаў і аператара УУС Гомельскага аблвыканкама на рацэ Сож затрымалі грамадзяніна з сеткамі і 11 асобінамі ляшча. У момант затрымання гэты грамадзянін прапаноўваў члену рэйдавай групы хабар у памеры 300 долараў. Па рацыі быў выкліканы бліжэйшы член групы, якім аказаўся аператар УУС Гомельскага аблвыканкама. Ужо ў яго прысутнасці затрыманая асоба прапаноўвала хабар у памеры 1000 долараў. Гэты факт быў зняты на відэакамеру. На месца затрымання выклікалася аператыўная група Веткаўскага РАУС. Праводзіцца разбор.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## БУДАЎНІК-НАРКАДЫЛЕР

**Супрацоўнікі аддзела па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі УУС Цэнтральнага раёна Мінска затрымалі раней судзімага жыхара сталіцы пры збыце метамфетаміну, паведаміў старшы інспектар групы інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мінска Аляксандр ДРОЗД.**

Асноўным відам дзейнасці малады чалавек з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй выбраў рамонт кватэр. Аднак, як высветлілася, акрамя абтынкоўвання сценаў, зламыснік проста на працоўным месцы займаўся гандлем асабліва небяспечным псіхатропным рэчывам — метамфетамінам. Аператыўнікамі быў зафіксаваны факт збыту псіхатропнага рэчыва, а ў кватэры, якая рамантавалася, выяўлены поліэтыленавыя скруткі з гэтым наркотыкам у скрыні з плафонамі, а пад адным з кубкаў — схаваныя грошы, утаргаваныя пры нядаўняй здзелцы.

Паводле слоў затрыманага, метамфетамін ён набыў у свайго знаёмага для асабістага ўжывання. Сваю віну малады чалавек поўнасцю прызнае, раскайваецца і тлумачыць злачынную дзейнасць цяжкім матэрыяльным становішчам — усё ж малалетняе дзіця на руках.

У адносінах да «клапатлівага» бацькі ўзбуджана крымінальная справа.

**Кар. БЕЛТА.**

## Пранцы і іншыя далікатныя хваробы — цяпер па-беларуску

— Пранцы іх бяры, пранцы іх еш няхай, — гэтыя выразы я чула ад сваёй бабулі не тое што праз слова, але вельмі часта. Калі была зусім малая, у гэтым дзіўным выразе мне чулася імя бацькі: яго клічуць Франц. І таму дзіцячай логікай усведамляла — калі яго маці хоча, каб ён гэта штосьці ўзяў — няхай бярэ, не шкада! «Франц іх бяры!» Калі падрасла, выраз стаў успрымацца інакш, але сэнс яго ўвогуле страціўся — прымаўка як прымаўка.

Толькі калі я пазнаёмілася з вучэбным слоўнікам скурных і венерычных хваробаў, які склаў гомельскі ўрач-дэрматавенеролаг Сяргей Сохар, зразумела, што слова «пранцы» на медыцынскай мове — не што іншае, як... сіфіліс. Сярод спецыфічных медыцынскіх тэрмінаў, якія звычайна маюць лацінскія карані, такіх цікавых у слоўніку не вельмі многа. Але ж яны ёсць. Вось прыклады для дапытлівых.

Диета — абяро́га
Кальций — ва́пень
Клетчатка — абало́міна
Лишай сухой — кругі́
Лишай мокрый і гнойный — шалу́ды
Лишай зудящий — пархі
Мягкий шанкр — мя́ккі ша́нкер
Рубец — блізна
Трещина — раско́ліна
Чешуйка — луска́вінка
Язва — раске́ліна

Загадчык кафедры паліклінічнай тэрапіі і агульнаўрачэбнай практыкі з курсам дэрматавенералогіі Эрык Платошкін, непасрэдны кіраўнік доктара Сохара, гаворыць, што веданне такіх народных назваў сімптомаў, магчыма, дапаможа знаходзіць хутчэй мову з пацыентамі, якія прыязджаюць з глыбінкі. Сярод 400 слоў, сабраных у слоўніку, ёсць і старажытныя, якія азначаюць самі хваробы.

Герпес — вогнік
Гонорея — ву́рзпель
Лепра (проказа) — стру́пля
Сифилис — пра́нцы
Туберкулёзная волчанка — сухо́тная ваўча́нка
Чесотка — каро́ста

Калі б доктар Сяргей Сохар быў кардыёлагам або рэнтгенолагам, відаць, было б не так цікава. Хаця... Гаворыць, калегі па працы спачатку ўспрымалі яго моўнае захапленне з усмешкай, а потым самі прасілі: «Дай пачытаць». Спецыяльных медыцынскіх слоўнікаў, і нават спасылак на іх у інтэрнэце зусім мала. Ёсць «Русско-белорусский медицинский словарь» В.Варанца. У тым ліку і яго ў сваёй працы выкарыстоўваў асістэнт кафедры Гомельскага медыцынскага ўніверсітэта. Сяргей Анатольевіч лічыць, што ў дзяржаве, дзе дзве мовы заяўлены як афіцыйныя, яны павінны і выкарыстоўвацца нараўне. Расказвае, што, калі ў пачатку 90-х вучыўся ў Гродзенскім медыцынскім інстытуце, былі падручнікі і дапаможнікі на беларускай мове.

— Былі і групы беларускамоўныя, нам лекцыі чыталі па-беларуску. А зараз усё, на жаль, толькі на адной мове. Але ж каб умоўна заўтра пачаць выкладаць па-беларуску, спатрэбіцца спецыяльная літаратура. Зараз яе няма.

Над сваім слоўнікам, выданне якога прысвечана Году роднай зямлі, дэрматавенеролаг карпеў месяц. Зараз яго вучэбны дапаможнік знаходзіцца на рэцэнзіі, і толькі пасля яе будзе надрукаваны. Здаецца, студэнтаў не давядзецца прымушаць яго чытаць — хаця б з-за юнацкай дапытлівасці. Увогуле ж аўтар спадзяецца, што ім стануць карыстацца не толькі выкладчыкі і студэнты, але і ўрачы. Менавіта таму ў анатацыі дэрматавенеролаг-практык гаворыць: «Няхай гэты сціплы слоўнік зойме сваё месца на рабочым стале студэнта, урача, выкладчыка. І тады сакавітая, адна з найбагацейшых еўрапейскіх моў — мова народа беларускага — будзе вашай роднай».

Сяргей Сохар гаворыць, што яму было б вельмі цікава стварыць і агульнамедыцынскі слоўнік. Але ж гэтую працу трэба рабіць разам з прафесіяналамі-філолагамі. А родныя дапамогуць. Вось і жонка-нарколаг добра ставіцца да яго працы. У галіне, дзе яна прафесіянал, у беларусаў дакладна павінна быць цікавая моўная спадчына.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Крынічка

*«Цякла тут з лесу невялічка*
*Травой зарослая крынічка».*
**Якуб КОЛАС.**

*Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81* № 12 (301)

### Як утрымліваць міжрадковыя плошчы ў садзе?

**Гаспадар, які пасадзіў сад, бачыць пустую плошчу паміж маладымі дрэўцамі і мае рацыю, калі займае яе патрэбнымі для яго раслінамі. Аднак не заўсёды правільна гэта робіцца, бо трэба ведаць, як блізка да дрэўца трэба размяшчаць такія пасадкі і да якога ўзросту будзе не на шкоду пладовым культурам утрыманне ў садзе гэтых «кватарантаў».**

У маладых садах дрэвы не поўнасцю выкарыстоўваюць адведзеную ім плошчу для паўнавартаснага росту і сілкавання, з прычыны таго, што каранёвая сістэма ў іх не так добра развіта, як у старых дрэў. Таму паміж маладымі дрэвамі можна садзіць аднагадовыя культуры, напрыклад, агародныя: моркву, рэдзьку, сталовыя буракі, радыску, бручку, цыбулю, часнок, салату, шпінат, гарох, фасолю, кабачкі, а таксама кветкі. Непрыдатныя для вырошчвання высокасцёблавыя расліны (сланечнік, кукуруза), таму што яны могуць заценяць маладыя дрэўцы, а таксама непажадана садзіць цукровыя буракі і збожжавыя культуры.

У моцнарослых яблыневых і грушавых садах міжрадковыя культуры можна вырошчваць да 6—8 гадоў, у садах на сярэднярослых і паўкарлікавых падвоях, дзе адлегласць паміж дрэвамі невялікая, перыяд вырошчвання міжрадковых культур скарачаецца да 3-4 гадоў, а ў карлікавым садзе месца паміж дрэвамі наогул пакідаюць свабодным. У любым выпадку не трэба высаджваць міжрадковыя культуры на прыствольных кругах. Некаторыя гаспадары так захапляюцца, што садзяць суніцы ці гародніну каля самага штамба дрэва. Гэта распаўсюджаная памылка.

Для ўзбагачэння глебы пажыўнымі рэчывамі можна высяваць сідэральныя культуры на зялёнае ўгнаенне. Сідэраты высяваюць у канцы чэрвеня — пачатку ліпеня. Сяўба сідэральных культур найбольш эфектыўная ў даждлівае лета. Найбольшы эфект дасягаецца пры выкарыстанні ў якасці сідэратаў бабовых культур (лубіну, фацэліі, вікі, гароху), таму што яны ўзбагачаюць глебу азотам. На пясчаных і глініста-пясчаных глебах добрыя вынікі дае сяўба лубіну, а на больш цяжкіх — гарчыцы або фацэліі. Сцёблы завораных у глебу раслін вясной інтэнсіўна раскладаюцца, павялічваючы ўтрыманне ў ёй пажыўных рэчываў менавіта ў той перыяд, калі яны больш за ўсё неабходны пладовым дрэвам.

### Сад на балконе

**Балкон можа даць гараджанам дадатковую магчымасць атрымаць асалоду ў час цвіцення і ўдыхаць водар кветак. Кожную вясну аматары хочуць прыдумаць штосьці новае. Паспрабуйце стварыць сад з раслін, якія ўюцца.**

Пасейце насенне **настуркі** па вонкавым краю скранкі. Частку плецяў падвяжыце да вяровачкі. Зацвітуць расліны праз 40-50 дзён пасля высеву і цвіценне будзе працягвацца да замаразкаў. На паўднёвым баку і ў гарачае лета без належнага паліву настурка можа адцвісці ў жніўні. Улічваючы гэта, варта падстрахавацца і падсеяць некалькі штук насення ў канцы мая—пачатку чэрвеня.

Адначасова з насеннем настуркі другім радком, бліжэй да ўнутранага боку, у красавіку—маі пасейце насенне **іпамеі**. Расліна цвіце з сярэдзіны чэрвеня—пачатку ліпеня да замаразкаў.



Выкарыстоўваючы гатункі іпамеі з кветкамі рознай афарбоўкі, можна стварыць эфектныя ажурныя сцены балкона. Трэба толькі забяспечыць апору ў выглядзе вертыкальных шнуроў па перыметры балкона.

**Духмяны гарошак** — адна з самых папулярных раслін, якая выкарыстоўваецца для вертыкальнага азелянення. Ёсць нізкарослыя гатункі з даўжынёй парасткаў 60—90 см, а вышыня карлікавых гатункаў не перавышае 40 см. Гэта расліна аддае перавагу сонечным месцам. Зацвітае праз 90—100 дзён пасля высеву насення, цвіце да замаразкаў. Прарослае насенне лепш за ўсё сеяць у маі адразу на пастаяннае месца, таму што расліна дрэнна пераносіць перасадку. Каб духмяны гарошак быў больш пышным і добра цвіў, прышчыкніце верхавінку над трэцяй парай лістоў.



**Фасоля вогненна-чырвоная** — адна з лепшых ліян. Кветкі сучасных гатункаў маюць не толькі чырвоны, але і белы, ружовы, крэмавы тоны. Расліна цеплалюбная і ценевынослівая. Цвіценне фасолі адбываецца праз 60—70 дзён пасля пасеву, яго можна ўзмацніць, калі як мага раней зрэзаць суквецці, якія адцвілі, а таксама стручкі з насеннем. Вараныя бабы можна есці, а вось сырыя — ядавітыя!

Можна пасадзіць на балконе і **эхінацысціс** (дзікі агурок), і **хмель японскі**, і **дзявочы вінаград**.

Некалькі парад па доглядзе балконных раслін:

Пасля высеву насення паліце зямлю ў скрынках цёплай вадой і прыкрыйце плёнкай — гэта абароніць насенне ад холаду і паскорыць іх прарастанне. Калі з'явяцца ўсходы, укрыццё здыміце, а на ноч для страхоўкі сеянцы накрывайце. Паліваць балконныя кветкі трэба цёплай вадой, якая адстаялася. Для гэтага напаўняюць бутэлькі і пакідаюць на сонцы — бліжэй да вечара вада для паліву гатовая.

Для падкормкі можна выкарыстаць угнаенне AVA, якое змяшчае ўсе неабходныя мікра- і макраэлементы (акрамя азоту). Для азотнага сілкавання выкарыстоўвайце ўніфлор-рост і ўніфлор-бутон. Такі варыянт сілкавання падыходзіць, калі ў глебу перад пасадкай не ўносілі іншыя ўгнаенні.

### Крапіва двухдомная

**Кампоставыя кучы даволі часта зарастаюць крапівой, але не спяшайцеся ператвараць яе ў зялёнае ўгнаенне.**

Як лекавая расліна крапіва вядома даўно. Авіцэна ў «Каноне ўрачэбнай навукі» кажа пра яе: «У лекавай павязцы з воцатам яна прымушае ўскрывацца нарывы, дапамагае загойвацца ім, прыносіць карысць пры зацвярдзеннях... Тоўчаныя лісты крапівы спыняюць крывацёкі з носа...» Менавіта кроваспыняльнае дзеянне крапівы пазней прыцягнула ўвагу медыкаў. З XVI ст. адвары з лістоў гэтай расліны сталі шырока прымяняць пры лёгачных, кішачных і матачных крывацёках. Кроваспыняльным дзеяннем лістоў крапівы абумоўлена наяўнасцю ў іх вітаміну К. У значнай колькасці ён накопліваецца толькі ў некаторых раслінах. Асабліва багатыя на вітамін К лісты каштана, крапівы, люцэрны і шпіната. Акрамя вітаміну К у крапіве змяшчаецца каля 200 міліграм-працэнтаў вітаміну С, карацін (правітамін А), вітаміны групы В, арганічныя кіслоты.

У народнай медыцыне крапіва выкарыстоўваецца як супрацьзапаленчы сродак пры захворваннях суставаў, як мачагонны пры вадзянцы, а таксама для прафілактыкі каменеўтварэння.

Крапіва вельмі папулярная ў народзе не толькі як лекавы сродак. Лічыцца вельмі карысным ужыванне супу з яе лістоў, часам разам са шчаўем. Пасля аблівання варам лісты страчваюць сваю пякучасць і тады іх выкарыстоўваюць для прыгатавання салатаў.

Зялёную масу крапівы лепш нарыхтоўваць у маі: у гэты час можна як збіраць лісцікі, так і проста адшчыкваць верхавінкі адрастаючых парасткаў. Карані крапівы, якія нарыхтоўваюць і вясной, і позна ўвосень, выкарыстоўваюць як супрацьглісны сродак, пры адэноме прастаты. Ёсць звесткі, што адвар з лістоў крапівы паніжае ўтрыманне цукру ў крыві. Крапіва служыць малакагонным сродкам, таму настой ці адвар з яе рэкамендуюць прымаць кормячым маці. Аднак гэта расліна супрацьпаказана пры павышанай згусальнасці крыві — можа выклікаць утварэнне тромба.

Касметолагі рэкамендуюць настой з крапівы як сродак для ўмацавання каранёў валасоў.

Сечаную траву крапівы прымешваюць у корм куранятам.

Пры рэўматызме, радыкуліце і міязітах рэкамендуюць выкарыстоўваць венікі невялікага памеру з крапівы ў час купання ў лазні. Відаць, поспех такога лячэння тлумачыцца раздражняльным дзеяннем крапівы, прылівам крыві, ляпшэннем кровазвароту.

### Сціплы букет ландышаў

**Ландышы ўслаўлялі і ўслаўляюць у вершах і ў музыцы, спрабуюць перадаць іх вытанчаны водар у парфуме, імі ўпрыгожваюць строі маладых нявестаў. Пяшчотнасць дробных зеленавата-белых бутончыкаў нібы нанізаных на сцяблінку, не можа пакінуць абыякавым ніводнага знатака прыгажосці.**

Ландышы — неад'емны кампанент лясоў. Аднак, трэба сказаць, што з кожным годам зараснікі ландышаў, асабліва вакол гарадоў, усё больш радзеюць. Звязана гэта з актыўным зборам раслін на продаж. Галоўная небяспека, якая пагражае лясным ландышам, — вытоптванне, з-за якога гінуць не толькі гэтыя кветкі, але і многія іншыя лясныя расліны. У большасці садаводчых даведнікаў і каталогаў ландыш характарызуецца як культура для зрэзвання. Можна і рваць ландышы, толькі трэба правільна гэта рабіць: пакідаючы некранутымі лісты, трэба плаўна выцягваць кветаносы. Ландышы размнажаюцца вегетатыўна, а вырыванне кветаносаў садзейнічае іх хуткаму разрастанню. Аднак трэба мець на ўвазе, што вельмі вялікія букеты ў закрытым памяшканні могуць стаць прычынай галавакружэння.

У цёплае надвор'е ландыш цвіце 15-20 дзён, у гарачае — крыху менш. Не паспееш налюбавацца яго прыгожосцю, як серабрыстыя венчыкі цямнеюць, зморшчваюцца і ападаюць. Замест іх з'яўляюцца цвёрдыя зялёныя пацеркі-плады. Яны паступова разрастаюцца да памераў гарошыны, а да восені робяцца аранжавачырвонымі. Іх яркі колер так і вабіць да сябе: хочацца сарваць гэтыя апетытныя ягады і пакаштаваць іх. Але не спяшайцеся! Салодкая мякаць гэтых ягад мае непрыемны смак, а насенне ядавітае, як ядавітая і ўся расліна.



Толькі птушкі склёўваюць іх, прапускаючы праз сябе насенне і тым самым дапамагаюць распаўсюджанню гэтых раслін. Вядома таксама, што ў лесе пладамі ландыша харчуюцца лісы. Усе часткі расліны ядавітыя, а найбольш — карані і плады. У традыцыйнай медыцыне ландыш выкарыстоўваецца як лекавая сыравіна. Кроплі Зяленіна прымяняюцца пры сардэчных захворваннях. І ўсё ж самалячэнне ландышам недапушчальна! Даўней лісты ландыша расціралі з вапнай і атрымлівалі прыгожую зялёную фарбу.

### ДАЧНЫЯ ПАДКАЗКІ

- Каб дапамагчы садовым суніцам добра прыжыцца, можна зрабіць баўтушку з сумесі гліны і каравяку. Каравяк і гліну змешваюць у роўных частках, робяць сумесь смятанападобнай і ў яе акунаюць перад пасадкай карані суніц садовых. Асабліва карысна рабіць гэта на пясчаных глебах, якія дрэнна ўтрымліваюць вільгаць.
- Календулу спецыялісты рэкамендуюць падсяваць да асноўнай агароднай культуры ў якасці прафілактычнага сродку супраць каранёвых гніляў, фузарыёзных захворванняў і кляшчоў.

## ГВАЛТАЎНІКАМ НЕ ПАЗДАРОВІЦЦА

**Яшчэ ў 2006 годзе неаднаразова судзімы лайдак (нідзе не працаваў) з вёскі Дуравічы Буда-Кашалёўскага раёна згвалтаваў дзяўчыну, і асоба яго да гэтага года не была выяўлена. Але за новае злачынства трапіў ён у турму, дзе вымушаны быў прызнацца і ў папярэднім згвалтаванні.**

А ў Гомелі за «белыя ручкі» ў міліцыю прывялі дырэктара аднаго з сельскагаспадарчых прадпрыемстваў па заяве маці 16-гадовай дзяўчыны, якую спакусіў 50-гадовы мужчына. На працягу чатырох месяцаў ён сустракаўся з няпоўнагадовай на патаемнай кватэры.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## ПРАТЭРМІНАВАНЫ «PEPSI»

**У Мінску ў прамзоне «Калядзічы» са склада аднаго з камерцыйных прадпрыемстваў было канфіскавана гэтага напою на агульную суму 30 мільёнаў рублёў.**

Буйная партыя «Pepsi», на які прайшоў тэрмін прыдатнасці, выяўлена падчас праверкі супрацоўнікамі аддзела па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі Першамайскага РУУС і Цэнтра гігіены і эпідэміялогіі па Кастрычніцкім раёне камерцыйнага прадпрыемства, якое займаецца пастаўкамі безалкагольных напояў. Праверачны «тэст» не прайшлі 20 тысяч банак напою «Pepsi» ёмістасцю па 0,33 літра. Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, да таго ж на частцы канфіскаваных банак адсутнічала маркіроўка, на якой былі б пазначаны тэрміны вырабу. Папярэдняя інфармацыя, якая ёсць у аператыўнікаў, сведчыць, што, магчыма, маркіроўка была наўмысна выдалена — гэта магло спрасціць далейшую рэалізацыю прадукцыі.

**Ігар ГРЫШЫН.**

# СУСВЕТНЫ БАНК МЯРКУЕ ПАДТРЫМАЦЬ БЮДЖЭТ

**Гэта думка стала лейтматывам прэс-брыфінгу Марціна Райзера, дырэктара аддзела Украіны, Беларусі і Малдовы Сусветнага банка, які два дні вёў у Мінску перамовы з прадстаўнікамі Урада аб паглыбленні супрацоўніцтва.**

А перад яго прыездам у нашай сталіцы два з паловай тыдні напружана працавала група экспертаў Сусветнага банка пад кіраўніцтвам вопытных спецыялістаў у сферы фінансаў. Размова з высокапастаўленымі чыноўнікамі ў асноўным ішла аб шляхах пашырэння ўзаемадзеяння Сусветнага банка з нашай краінай, як потым сам Марцін Райзер патлумачыў на сустрэчы з журналістамі мэты свайго візіту. У прыватнасці, перамовы вяліся аб прадастаўленні ў сярэдзіне гэтага года пазыкі на мэты развіцця энергаэфектыўнасці аб'ёмам $125 мільёнаў, таксама пазыкі на стварэнне магутнасцяў па перапрацоўцы цвёрдых бытавых адыходаў у Гродне.

Але галоўнай тэмай перамоў стала абмеркаванне просьбы Урада аказаць фінансавае садзейнічанне ў правядзенні праграмы эканамічных рэформаў на ўмовах глабальнага фінансавага крызісу. Дакладней, аб прадастаўленні пазыкі, як сказаў дырэктар аддзела, «на падтрымку бюджэту». Праўда, Марцін Райзер наадрэз адмовіўся называць хоць бы прыблізна суму пазыкі. Ён толькі паведаміў, што дыскусіі прадстаўнікоў Сусветнага банка з Урадам ішлі па трох напрамках: меры па паляпшэнні бізнэс-асяроддзя ў нашай краіне, павышэнне эфектыўнасці кіравання рэсурсамі, абарона слабых слаёў насельніцтва, якія больш за ўсё церпяць ад крызісу. Па яго словах, ёсць усе надзеі на тое, што гэтая праграма эканамічных рэформаў атрымае належнае фінансаванне пасля неабходных удакладненняў і дамоўленасцяў.

Разам з тым Марцін Райзер адзначыў, што беларускі Урад у апошнія месяцы прымае рашучыя меры па супрацьдзеянні наступствам глабальнага фінансавага крызісу, напрыклад, праводзіць паступовую лібералізацыю эканомікі краіны. Ён таксама падкрэсліў неабходнасць для нас працягваць правядзенне палітыкі макраэканамічнай стабілізацыі, аднačасова паскараць і шматлікія структурныя рэформы. Беларусь, як і шматлікія краіны рэгіёна, адчула сур'ёзнае ўздзеянне глабальнага эканамічнага і фінансавага крызісу, канстатаваў госць. Таму яе падтрымка ў рамках перагледжанай Стратэгіі супрацоўніцтва з Беларуссю будзе наладжана такім чынам, каб мінімізаваць сацыяльныя наступствы крызісу, падтрымаць эканамічную стабільнасць і дапамагчы закласці асновы ўстойлівага аднаўлення праз узмацненне структурных пераўтварэнняў.

На думку Марціна Райзера і яго калег з Сусветнага банка, па-ранейшаму, нізкі ўзровень знешняга доўгу дазваляе Беларусі больш аптымістычна, чым іншым краінам, глядзець у будучыню і з меншымі стратамі перажыць крызіс.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

**В публикации годового баланса ООО «Форвард-Брокер»** (газета «Звязда» № 70 от 15.04.2009 г.) следует читать:
код строки 110 — 377 234,1 тыс. руб.
строка баланс в колонке актив — 475 580,0 тыс. руб.
код строки 430 — 383 643,4 тыс. руб.
строка баланс в колонке пассив — 475 580,0 тыс. руб.

**Бланк ЗАСО «Белнефтестрах»** по добровольному страхованию наземных транспортных средств граждан; добровольному страхованию наземных транспортных средств юридических лиц серии НС № 018958, серии НС № 018959 **считать недействительными.**

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Королевское Гран-При»

1. Настоящая рекламная игра называется **«Королевское Гран-При»**, проводится в соответствии с условиями настоящих правил с соблюдением требований законодательства Республики Беларусь без взимания с участников Игры дополнительной платы.

Игра имеет цель — дополнительное увеличение посетителей (клиентов) казино «Royal», город Минск, проспект Независимости, 11, корп. 1.

2. Организатором Игры является ООО «Дакарай», расположенное по адресу: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, пр. Независимости, 11/2-610. Учетный номер плательщика 190617507. Свидетельство № 614 о государственной регистрации коммерческой организации выдано Мингорисполкомом 18 апреля 2005 г. (далее по тексту – «Организатор»).

3. Игра проводится в казино «Royal» по адресу: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, пр. Независимости, 11, корп. 1 в период **с 26 апреля 2009 года по 17 июля 2009 года** (включительно).

4. Призовой фонд Игры.

Призовой фонд Игры формируется в полном объеме за счет чистой прибыли Организатора Игры – ООО «Дакарай». Призом Игры является автомобиль Мерседес-Бенц Е 300 кузов W212 стоимостью 169 185 960 (сто шестьдесят девять миллионов сто восемьдесят пять тысяч девятьсот шестьдесят) белорусских рублей.

5. В Игре в период ее проведения могут принять участие совершеннолетние физические лица в возрасте старше 18 лет (далее по тексту — «Участники») с учетом ограничений, изложенных в настоящих Правилах.

В Игре не имеют права участвовать работники и представители Организатора Игры, работники предприятий, связанных с Организатором договорными отношениями (обслуживающих Игру), а также члены семей названных работников и представителей, работники и представители любых других юридических лиц, имеющих отношение к организации и/или проведению настоящей Игры, а также члены их семей.

6. Описание Игры.

**Механизм проведения Игры:**

• Для того чтобы принять участие в Игре и розыгрыше призов, Участнику следует в период с 26 апреля 2009 года по 17 июля 2009 года посетить казино «Royal», расположенное по адресу г. Минск, пр. Независимости, 11, корп. 1 и принять участие в играх «ПОКЕР» стол № 1 и/или «РУЛЕТКА» стол № 1 и/или «БЛЭК ДЖЭК» стол № 1. Нумерация столов указана на столах.

При этом Участнику игры «ПОКЕР» независимо от игры у «дилера» выдаются игровые купоны при условии ставки и за выпадение комбинаций согласно таблице:

| комбинация/ставка | 10 у.е.–25 у.е. | 30 у.е.–55 у.е. | 60 у.е.–95 у.е. | 100 у.е.–300 у.е. | >300 у.е. |
|---|---|---|---|---|---|
| «Стрит» | — | 1 | 2 | 4 | 6 |
| «Флэш» | — | 2 | 4 | 6 | 8 |
| «Фул Хауз» | 2 | 3 | 5 | 8 | 10 |
| «Карэ» | 4 | 5 | 10 | 15 | 20 |
| «Стрит флэш» | 5 | 10 | 20 | 25 | 30 |
| «Роял флэш» | 10 | 20 | 30 | 50 | 70 |

Участнику игры «БЛЭК ДЖЭК» выдаются игровые купоны при условии ставки и за выпадение комбинаций согласно таблице:

| комбинация/ставка | 10 у.е.–25 у.е. | 30 у.е.–55 у.е. | 60 у.е.–95 у.е. | 100 у.е.–245 у.е. | 250 у.е.—300 у.е. |
|---|---|---|---|---|---|
| «7», «7» или «Блэк Джэк» | — | — | — | — | 1 |
| «Блэк Джэк одной масти» | — | 1 | 2 | 4 | 6 |
| «6», «7», «8» или «7», «7», «7» разной масти | 2 | 4 | 6 | 8 | 10 |
| «6», «7», «8» или «7», «7», «7» одной масти | 4 | 6 | 8 | 10 | 20 |

Участнику игры «РУЛЕТКА» выдаются игровые купоны при условии выплаты при выпадении номера на столе согласно таблице:

| номер/выплата | 200 у.е.–500 у.е. | 501 у.е.–1000 у.е. | 1001 у.е.–5000 у.е. | 5001 у.е.–10 000 у.е. | >10 000 у.е. |
|---|---|---|---|---|---|
| номер равный числу дня | 1 | 2 | 3 | 5 | 7 |
| при повторе выпадения номера (один за другим) | 1 | 2 | 3 | 5 | 7 |

Также игроку игры «РУЛЕТКА» выдаются купоны при выплате сумм, согласно таблице, кроме выплат со ставок на дюжины, колонки, большие и малые номера, четные и нечетные номера, красные и черные номера:

| выплата | 500 у.е.–1000 у.е. | 1001 у.е.–5000 у.е. | 5001 у.е.–10 000 у.е. | >10 000 у.е. |
|---|---|---|---|---|
| количество купонов | 1 | 2 | 3 | 5 |

Стоимость у.е. (условной единицы) – 2790 белорусских рублей.

Купоны выдаются в период проведения рекламной игры с 23 час. 00 мин. 26 апреля 2009 года до 21 час. 00 мин. 17 июля 2009 года.

Каждый купон, состоит из двух частей, имеющих свой идентификационный номер.

Участник Игры, получивший купон, по линии отрыва разделяет купон на две половины, одну половину оставляет себе, вторую – возвращает сотруднику Организатора Игры. Переданные Организатору Игры купоны регистрируются с указанием имени и первой буквы фамилии. В лототрон помещаются купоны игроков, набравшие 10 и более купонов.

Получение купона Участника Игры подтверждает факт ознакомления и полное согласие Участника с Правилами Игры, выражает желание Участника участвовать в Игре, а также обязывает присутствовать при проведении розыгрыша призового фонда Игры.

Организатор имеет право проводить дополнительные экспертизы купонов участников Игры, в том числе с привлечением экспертов. Поддельные купоны Участника Игры, к участию в Игре не допускаются. Идентификация купонов Участника Игры осуществляется работниками Организатора Игры.

7. В рамках Игры создается комиссия по проведению рекламной игры. Комиссия осуществляет свою деятельность в период проведения рекламной игры с 26 апреля 2009 года по 17 июля 2009 года.

**Регламент деятельности комиссии по проведению рекламной игры:**

• Персональный состав комиссии утверждается приказом директора ООО «ДАКАРАЙ». В состав комиссии входят 3 человека – председатель и два члена комиссии.

• Решение комиссии признается действительным при условии присутствия большинства членов из общего состава комиссии.

• Член комиссии ведет протокол заседаний комиссии.

• В протоколе розыгрыша призового фонда отражается время и место проведения розыгрыша призового фонда, сведения о составе комиссии по проведению розыгрыша, действия комиссии по проведению розыгрыша в том порядке, в каком они совершались, результаты проведения розыгрыша с указанием выигравшего купона и сведений о победителе, обладателе Приза рекламной игры.

• Протокол подписывают все члены комиссии, присутствующие при проведении заседания комиссии.

• Протокол заседания комиссии по проведению розыгрыша приза рекламной игры является основанием для выдачи приза победителю.

• Комиссия уполномочена рассматривать жалобы и предложения со стороны участников Игры.

8. **Розыгрыш приза** Игры состоится по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 11, казино «Royal» в присутствии комиссии по проведению рекламной игры и участников игры 17 июля 2009 года в 23.00.

Все зарегистрированные и допущенные к участию в розыгрыше купоны Участника Игры помещаются представителем Организатора в лототрон и перемешиваются. Один из членов комиссии случайным образом вытягивает купоны Участника Игры из лототрона, объявляется идентификационный номер купона. Если в зале отсутствует владелец второй части купона с данным индентификационным номером, то из лототрона вынимается следующий купон. Данная процедура повторяется до тех пор, пока не будет вытянут купон с идентификационным номером, совпадающим с номером купона, присутствующего в зале участника Игры. Таким образом, определяются 37 участников Игры. Далее Игра проводится на игровом столе «Американская рулетка». Купон игрока, который был определен для участия первым, помещается на игровое поле «Американской рулетки» на номер «0». Купон игрока, который был определен вторым, помещается на игровое поле «Американская рулетка» на номер «1». Таким образом заполняются номера от «0» до «36». Дилер запускает шарик рулетки. Игрок, чей билет находится на выпавшем номере, является первым финалистом. На освободившийся номер на столе «Американская рулетка» один из членов комиссии вытягивает из лототрона купон. Дилер снова запускает шарик. Процедура повторяется до тех пор, пока не определятся еще два финалиста. После этого трем финалистам выдаются три игрушечные машинки «Мерседес». Машинки помещаются игроками на игровом поле «Американская рулетка» на номер «0». Финалисты бросают игральную кость в той очередности, которой выходили в финал. Сколь точек выпадает на игральной кости, на столько номеров игрок передвигает свою машинку. Победителем становится тот финалист, который первым доведет свою машинку до номера «36» игрового стола. Даже если у кого-то из остальных финалистов осталась возможность сделать еще бросок. Финалист-победитель получает приз – автомобиль, указанный в пункте 4 настоящих Правил.

9. По итогам розыгрыша составляется и подписывается членами комиссии протокол розыгрыша. Решение комиссии, касающееся результата розыгрыша Призового фонда, является окончательным и обязательным для всех участников и не может быть изменено.

10. О рекламной игре можно получить информацию, позвонив по телефону «горячей линии» (8029)1113333 ежедневно с 09.00 до 24.00, либо непосредственно в казино «Royal» по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 11, корп. 1.

11. Вручение приза Игры будет осуществляться по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр. Независимости, 11, корп. 1, казино «Royal» в срок до 22 июля 2009 года.

12. Для получения приза выигравшему Участнику Игры, необходимо иметь при себе паспорт, удостоверяющий личность и вторую половину игрового купона для сверки его идентификационного номера с номером выигрышного купона.

Если Победитель Игры самостоятельно не явится за получением приза по адресу, указанному в п. 11 настоящих Правил, Победитель лишается права на получение приза.

Если победителем становится лицо, признанное недееспособным или ограниченно дееспособным, право получения приза переходит к его законным представителям – родителям, усыновителям или попечителям.

13. Победитель Игры несет ответственность за уплату всех применимых налогов и предоставление налоговой отчетности, установленных действующим законодательством Республики Беларусь, связанных с получением призов Игры.

14. Организатор не оплачивает Участнику Игры расходы, связанные с проездом к месту получения приза Игры.

15. Приз не подлежит замене, выплата денежного эквивалента стоимости приза не осуществляется.

Ответственность Организатора по выдаче приза ограничивается исключительно указанным в настоящих Правилах количеству и виду приза. Организатор Игры не несет ответственность за любые риски, связанные с повреждением приза и его эксплуатацией, возникшие после выдачи приза победителю.

Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках рекламной игры их имена, фамилии, фотографии, интервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором. Участники Игры по их согласию могут давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в Интернете, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения. Все права на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

16. Информирование о проведении Игры и ее условиях производится посредством размещения рекламы в средствах массовой информации, с использованием средств наружной рекламы, выпуском полиграфической продукции.

Настоящие Правила, сведения о Призовом фонде Игры и порядке его формирования, сведения о составе комиссии по проведению рекламной игры и регламенте ее работы подлежат публикации в средствах массовой информации до начала рекламной игры.

Информация о результатах розыгрыша Призового фонда Игры будет опубликована **не позднее 27 июля 2009 года** в том же СМИ, где будут опубликованы правила настоящей Игры.

Дополнительно информация может быть размещена в других средствах массовой информации.

17. Участие в Игре автоматически подразумевает ознакомление с настоящими Правилами и согласие участников Игры следовать всем условиям настоящих Правил. Несоблюдение Участником выполнения настоящих Правил считается его отказом от участия в Игре.

**Председатель:**

• Лесков Сергей Александрович (Место работы – ООО «Дакарай», должность – начальник смены);

**Члены комиссии:**

• Чеславская Ольга Геннадьевна (Место работы – ООО «Дакарай», должность – заместитель начальника смены);

• Герко Андрей Александрович (Место работы – ООО «Дакарай», должность – заместитель начальника смены).

Комиссия будет осуществлять свою деятельность в период проведения рекламной игры с 26 апреля 2009 года по 17 июля 2009 года.

*Свидетельство о государственной регистрации Правил проведения рекламной игры выдано Министерством торговли Республики Беларусь за № 1401 от 21.04.2009 г. УНП 190617507*

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «100 Франклинов»

1. Настоящая рекламная игра называется **«100 Франклинов»**, проводится в соответствии с условиями настоящих правил с соблюдением требований законодательства Республики Беларусь без взимания с участников игры дополнительной платы.

Игра имеет цель: дополнительное увеличение посетителей (клиентов) казино и зала игровых автоматов «Royal», город Минск, проспект Независимости, 11, корп. 1.

2. Организатором Игры является ООО «Дакарай», расположенное по адресу: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, пр. Независимости, 11/2-610. Учетный номер плательщика 190617507. Свидетельство № 614 о государственной регистрации коммерческой организации выдано Мингорисполкомом 18 апреля 2005 г. (далее по тексту – «Организатор»).

3. Игра проводится в казино и зале игровых автоматов «Royal» по адресу: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, пр. Независимости, 11, корп.1 в период **с 30 апреля 2009 года по 25 июня 2009 года** (включительно).

4. Призовой фонд Игры.

Размер Призового фонда Игры составляет **55 800 000 (пятьдесят пять миллионов восемьсот тысяч)** белорусских рублей и формируется в полном объеме за счет чистой прибыли Организатора Игры – ООО «Дакарай». Состав призового фонда:

| Вид приза | Количество | Сумма, бел. руб. | Общая сумма, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Денежный приз | 2 | 27 900 000 | 55 800 000 |

5. В Игре в период ее проведения могут принять участие совершеннолетние физические лица в возрасте старше 18 лет (далее по тексту «Участники») с учетом ограничений, изложенных в настоящих Правилах.

В Игре не имеют права участвовать работники и представители Организатора Игры, работники предприятий, связанных с Организатором договорными отношениями (обслуживающих Игру), а также члены семей названных работников и представителей, работники и представители любых других юридических лиц, имеющих отношение к организации и/или проведению настоящей Игры, а также члены их семей.

6. Описание Игры.

**Механизм проведения Игры:**

• Для того чтобы принять участие в Игре и розыгрыше призов Участнику следует в период с **30 апреля 2009 года по 25 июня 2009 года** посетить казино и зал игровых автоматов «Royal», расположенные по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 11, корп. 1 и принять участие в играх «ПОКЕР» столы № 2,3 и/или «РУЛЕТКА» стол № 2, и/или «Блэк Джек» стол № 2, и/или играх на игровых автоматах.

При этом участнику игры «ПОКЕР» независимо от игры у «дилера» выдаются игровые купоны при условии ставки и за выпадение комбинаций согласно таблице:

| комбинация/ставка | 10 у.е.–25 у.е. | 30 у.е.–55 у.е. | 60 у.е.–95 у.е. | 100 у.е.–300 у.е. | >300 у.е. |
|---|---|---|---|---|---|
| «Стрит» | — | 1 | 2 | 4 | 6 |
| «Флэш» | — | 2 | 4 | 6 | 8 |
| «Фул Хауз» | 2 | 3 | 5 | 8 | 10 |
| «Карэ» | 4 | 5 | 10 | 15 | 20 |
| «Стрит флэш» | 5 | 10 | 20 | 25 | 30 |
| «Роял флэш» | 10 | 20 | 30 | 50 | 70 |

Участнику игры «БЛЭК ДЖЕК» выдаются игровые купоны при условии ставки и за выпадение комбинаций согласно таблице:

| комбинация/ставка | 10 у.е.–25 у.е. | 30 у.е.–55 у.е. | 60 у.е.–95 у.е. | 100 у.е.–245 у.е. | 250 у.е.—300 у.е. |
|---|---|---|---|---|---|
| «7», «7» или «Блэк Джек» | — | — | — | — | 1 |
| «Блэк Джек одной масти» | — | 1 | 2 | 4 | 6 |
| «6», «7», «8» или «7», «7», «7» разной масти | 2 | 4 | 6 | 8 | 10 |
| «6», «7», «8» или «7», «7», «7» одной масти | 4 | 6 | 8 | 10 | 20 |

Участнику игры «РУЛЕТКА» выдаются игровые купоны при условии выплаты при выпадении номера на столе согласно таблице:

| номер/выплата | 200 у.е.–500 у.е. | 501 у.е.–1000 у.е. | 1001 у.е.–5000 у.е. | 5001 у.е.–10 000 у.е. | >10 000 у.е. |
|---|---|---|---|---|---|
| номер равный числу дня | 1 | 2 | 3 | 5 | 7 |
| при повторе выпадения номера (один за другим) | 1 | 2 | 3 | 5 | 7 |

Также игроку игры «РУЛЕТКА» выдаются купоны при выплате сумм, согласно таблице, кроме выплат со ставок на дюжины, колонки, большие и малые номера, четные и нечетные номера, красные и черные номера:

| выплата | 500 у.е.–1000 у.е. | 1001 у.е.–5000 у.е. | 5001 у.е.–10 000 у.е. | >10 000 у.е. |
|---|---|---|---|---|
| количество купонов | 1 | 2 | 3 | 5 |

Стоимость у.е. (условной единицы) – 2 790 белорусских рублей.

При **игре на игровых автоматах** купоны выдаются оператором игровых автоматов в следующих случаях:

- за выплату 200 000 белорусских рублей единовременно в результате выигрышной комбинации – 1 купон;

- за выплату 200 000 белорусских рублей в случае удвоения или бонусной игры – 1 купон.

Если выплата превышает 200 000 белорусских рублей, купоны выдаются за каждые 200 000 белорусских рублей, но не более 7 купонов за один раз.

После выпадения выигрыша, игрок, не переводя выигрыш в кредит, ОБЯЗАН пригласить оператора игровых автоматов для подтверждения выигрышной комбинации.

Купоны выдаются в период проведения рекламной игры с **00 час. 00 мин. 30 апреля 2009 года до 21 час. 00 мин. 25 июня 2009 года.** Выдача купонов для участия в дни розыгрыша заканчивается за два часа (то есть в 21.00) до начала соответствующего розыгрыша.

Каждый купон состоит из двух частей, имеющих свой идентификационный номер.

Участник Игры, получивший купон, по линии отрыва разделяет купон на две половины, одну половину оставляет себе, вторую – возвращает сотруднику Организатора Игры. Переданные Организатору Игры купоны регистрируются с указанием имени и первой буквы фамилии. В лототрон помещаются купоны игроков, набравшие 10 и более купонов.

Получение купона участника Игры подтверждает факт ознакомления и полное согласие Участника с Правилами Игры, выражает желание Участника участвовать в Игре, а также обязывает присутствовать при проведении розыгрыша призового фонда Игры.

Организатор имеет право проводить дополнительные экспертизы купонов участников игры, в том числе с привлечением экспертов. Поддельные купоны участника игры, к участию в Игре не допускаются. Идентификация купонов участника игры осуществляется работниками Организатора Игры.

7. В рамках Игры создается комиссия по проведению рекламной игры. Комиссия осуществляет свою деятельность в период проведения рекламной игры **с 30 апреля 2009 года по 25 июня 2009 года.**

**Регламент деятельности комиссии по проведению рекламной игры:**

• Персональный состав комиссии утверждается приказом директора ООО «ДАКАРАЙ». В состав комиссии входят 3 человека – председатель и два члена комиссии.

• Решение комиссии признается действительным при условии присутствия большинства членов из общего состава комиссии.

• Член комиссии ведет протокол заседаний комиссии.

• В протоколе розыгрыша призового фонда отражается время и место проведения розыгрыша призового фонда, сведения о составе комиссии по проведению розыгрыша, действия комиссии по проведению розыгрыша в том порядке, в каком они совершались, результаты проведения розыгрыша с указанием выигравшего купона и сведений о победителе, обладателе Приза рекламной игры.

• Протокол подписывают все члены комиссии, присутствующие при проведении заседания комиссии.

• Протокол заседания комиссии по проведению розыгрыша приза рекламной игры является основанием для выдачи приза победителю.

• Комиссия уполномочена рассматривать жалобы и предложения со стороны участников Игры.

8. **Розыгрыш приза:** Игры состоятся по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 11, казино «Royal» в присутствии комиссии по проведению рекламной игры и участников игры по следующему графику: **28 мая 2009 г., 25 июня 2009 г., начало розыгрышей в 23.00.** Определение победителей игры будет проводиться посредством случайной выборки купонов участников Игры.

К каждому розыгрышу допускаются игровые купоны, полученные в срок до момента проведения каждого розыгрыша. После проведения каждого розыгрыша, игровые купоны, участвовавшие в розыгрыше, в дальнейших розыгрышах участие не принимают.

Все зарегистрированные и допущенные к участию в розыгрыше купоны участника игры помещаются представителем Организатора в лототрон и перемешиваются. Один из членов комиссии случайным образом вытягивает купоны участника игры из лототрона, объявляется идентификационный номер купона. Если в зале отсутствует владелец второй части купона с данным идентификационным номером, то из лототрона вынимается следующий купон. Данная процедура повторяется до тех пор, пока не будет вытянут купон с идентификационным номером, совпадающим с номером купона, присутствующего в зале участника Игры. Таким образом определяются 37 участников Игры. Далее Игра проводится на игровом столе «Американская рулетка». Купон игрока, который был определен для участия первым, помещается на игровое поле «Американской рулетки» на номер «0». Купон игрока, который был определен вторым, помещается на игровое поле «Американская рулетка» на номер «1». Таким образом заполняются номера от «0» до «36». Дилер запускает шарик рулетки. Игрок, чей билет находится на выпавшем номере, является первым финалистом. На освободившийся номер на столе «Американская рулетка» один из членов комиссии вытягивает из лототрона купон. Дилер снова запускает шарик. Процедура повторяется до тех пор, пока не определятся еще два финалиста. Один и тот же игрок может быть финалистом несколько раз. После этого купоны трех финалистов раскладываются на три «дюжины» в той последовательности, в которой определялись финалисты. Дилер запускает шарик. Победителем становится игрок, которому досталась «дюжина», в которую входит номер, соответствующий номеру, выпавшему в колесе на рулетке. В случае выпадения номера «0» дилер перезапускает шарик.

Финалист-победитель получает денежный приз в размере 27 900 000 рублей.

9. По итогам розыгрыша составляется и подписывается членами комиссии протокол розыгрыша. Решение комиссии, касающееся результатов соответствующего Правилам розыгрыша Призового фонда, является окончательным и обязательным для всех участников и не может быть изменено.

10. О рекламной игре можно получить информацию, позвонив по телефону «горячей линии» (8029)1113333 ежедневно с 09.00 до 24.00, либо непосредственно в казино «Royal» по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 11, корп.1.

11. Вручение призов будет осуществляться по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр. Независимости, 11, корп.1, казино «Royal» в срок до **01 июля 2009 года** (включительно).

12. Для получения приза выигравшему участнику Игры необходимо иметь при себе паспорт, удостоверяющий личность, и вторую половину игрового купона для сверки его идентификационного номера с номером выигрышного купона.

Выдача призов производится в пределах заявленного Призового фонда.

С момента получения приза, а также любого иного дохода в рамках Игры, любой Участник несет ответственность за уплату всех применимых налогов, установленных действующим законодательством Республики Беларусь.

Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках рекламной игры их имена, фамилии, фотографии, интервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором. Участники игры по их согласию могут давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в Интернете, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения. Все права на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

13. Настоящие Правила, сведения о Призовом фонде игры и порядке его формирования, сведения о составе комиссии по проведению рекламной игры и регламенте ее работы, будут опубликованы в газете «Звязда» до начала рекламной игры.

Информация о результатах розыгрыша Призового фонда Игры будет опубликована не позднее **10 июля 2009 года** в том же СМИ, где будут опубликованы правила настоящей Игры.

Дополнительная информация может быть размещена в других средствах массовой информации.

14. Участие в Игре автоматически подразумевает ознакомление с настоящими Правилами и согласие участников Игры следовать всем условиям настоящих Правил. Несоблюдение Участником выполнения настоящих Правил считается его отказом от участия в Игре.

Состав комиссии по проведению рекламной игры **«100 Франклинов»:**

**Председатель комиссии:**

• Лесков Сергей Александрович (Место работы – ООО «Дакарай», должность – начальник смены)

**Члены комиссии:**

• Чеславская Ольга Геннадьевна (Место работы – ООО «Дакарай», должность – заместитель начальника смены)

• Герко Андрей Александрович (Место работы – ООО «Дакарай», должность – заместитель начальника смены)

Комиссия будет осуществлять свою деятельность в период проведения рекламной игры **с 30 апреля 2009 года по 25 июня 2009 года.**

*Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 1402 от 21.04.2009 года выдано Министерством торговли Республики Беларусь. УНП 1960617507*

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



# КАТЫ АКТЫЎНІЧАЮЦЬ, нібыта на пачатку вясны

## Насамрэч таму, што яны сакавіцкія. І на мастацкай выставе

Колькі ні малюй катоў, яны ніколі не будуць падобныя адзін на аднаго. Сапраўды, нібыта людзі. І палашчыць іх хочацца, таму што здаецца, што вось зараз яны саскочаць з карцін у залу, ці ажывуць дзіўнаватыя каціныя скульптуры, каб даказаць: у гэтым свеце магчыма ўсё і не трэба шмат фантазіі, каб некаму даць надзею на жыццё. Дзеля гэтага і задумваўся мастацкі праект «Сакавіцкія каты» — міжнародныя дабрачынныя выставы арганізоўваюцца ў падтрымку хворых дзяцей.

— «Сакавіцкія каты» — традыцыйная выстава, з яе пачынаецца вясна. А вясна — гэта сімвал надзеі, — падкрэсліла Ала Нароўская, куратар выставы.

Вясна, якую хацелі падштурхнуць добрымі справамі мастакі, сёлета адкладвалася, было невядома, у якой зале можна будзе паглядзець выставу. І ў красавіку дзверы для яе адчыніла галерэя «Універсітэт культуры». Сёлета ў шостай Міжнароднай дабрачыннай выставе бяруць удзел 126 мастакоў з 6 краін свету — Беларусі, Літвы, Польшчы, Сербіі, Расіі, ЗША.



Арганізатары з Міжнароднага грамадскага аб'яднання мастакоў і мастацтвазнаўцаў «Майстар», паводле слоў яго кіраўніка Сяргея Крыштаповіча, збіраюцца правесці аўкцыён, каб сабраць сродкі ў падтрымку праграмы «Дзіцячае сэрца». Прадаваць ёсць што: на выставе дэманструецца каля 400 твораў жывапісу, графікі, скульптуры і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Ужо ў маі інтэрнацыянальная брыгада кардыяхірургаў будзе праводзіць аперацыі цяжкахворым дзецям з парокамі сэрца. Сродкі ад аўкцыёна будуць накіраваныя на постаперацыйную рэабілітацыю малых, якія растуць у малазабяспечаных сем'ях. Карыне Малафей з Баранавіцкага раёна пакуль толькі тры месяцы, Кірылу Кляпацкаму з Полацка — адзін годзік, Валянціне Аўсяннікавай з Жодзіна — тры гады. Гэта сапраўды вясна надзеі для іх бацькоў.

**Вольга ГРЫКІНА.**





## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.51 | 20.26 | 14.35 |
| Віцебск — | 5.37 | 20.19 | 14.42 |
| Магілёў — | 5.41 | 20.16 | 14.35 |
| Гомель — | 5.42 | 20.09 | 14.27 |
| Брэст — | 6.06 | 20.41 | 14.35 |
| Гродна — | 6.11 | 20.37 | 14.26 |

### Месяц

***Маладзік.***
***Месяц у сузор'і Авена.***

### Імяніны

***Пр.*** *Аляксандра, Максіма, Рыгора, Фёдара, Якава.*
***К.*** *Ілона, Войцэха, Юрыя.*



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.




...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +16..+18°С | КІЕЎ +13..+15°С | РЫГА +12..+14°С |
| ВІЛЬНЮС +15..+17°С | МАСКВА +8..+10°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +10..+12°С |

Ну і ну!

## Прыйшоў у госці і... адкусіў нос

**Гэта здарылася ў Петрыкаве якраз на стары Новы год апоўначы, калі да 32-гадовага жыхара райцэнтра прыйшоў адзначыць свята яго знаёмы, які на той час нідзе не працаваў. І тут мы дадзім слова ўчастковаму інспектару райаддзела ўнутраных спраў Івану Занкевічу. Вось што ён расказаў.**

Мужчыны сядзелі, выпівалі, баялі байкі пра жыццё і сваё, і іншых. Дайшло ўжо да таго, калі, напэўна, доза алкаголю моцна пеканула па іх галовах і яны пачалі высвятляць, хто каго больш паважае. Пачаліся гарачыя спрэчкі, якія, аднак, да кулачнага бою, як гэта нярэдка адбываецца ў такіх выпадках, не дайшлі. Больш за ўсё разгарачыўся госць, які брыдкімі словамі абразіў гаспадара.

Каб зняць напружанасць, той, наадварот, пайшоў на прымірэнне. Прапанаваўшы себруку правесці яго да дзвярэй, ён (мужчыны стаялі адзін насупраць другога) абняў яго. І ў гэты самы момант госць спрытна зубамі цапнуў нос гаспадара, адкусіў значную яго частку, выплюнуў і (дзе толькі ўзяўся спрыт?) даў дзёру з кватэры.

Пацярпелы падаў заяву ў міліцыю на тое, што ў яго зараз сапсаваны твар, і гэта ўжо не выправіш ніяк. З прычыны доўгай адсутнасці крыўдзіцеля па месцы жыхарства матэрыялы крымінальнай справы адкладваліся. Цяпер жа ідзе следства. Некаторыя жыхары Петрыкава з нагоды гэтага незвычайнага здарэння жартуюць: а што калі б нос — за нос?

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Сканворд (21 красавіка). Па гарызанталі:** Пярсцёнак. Сырэц. Трыр. Кулон. «Ака». Адам. Калым. Паля. Кананір. Працяг. Ліпа. Форум. Брошка. Авал. Вал. Кома. Кароль. Наскок. Мяжа. Кол. Семяед. Імпэт. Дар. Панама. Аса. Бенефіс. Габелен. **Па вертыкалі:** Макака. Бранзалет. Ландо. Аксу. Рывок. Нанду. «Амок». Малако. Акр. Ліда. Ачыстка. «Манас». Рала. Прас. Эры. Маг. Моц. Рампа. Кастра. Юрта. Напал. Рым. Маці. Шво. Ляп. Калье. Дыяганаль. Дзёран.

**Сканворд (22 красавіка). Па гарызанталі:** Хемінгуэй. Газета. Юта. Акот. Пярун. Малпа. Твэн. Аліса. Судак. Робат. Бататаг. Бас. Гало. Скіп. Алей. Ром. Смык. Туз. Дула. Ачаг. Мапасан. Арала. Рака. Кляп. Тува. Пік. Затакт. **Па вертыкалі:** Туба. Гама. Трэст. Алыча. Лекар. Строй. Гарбуз. Хіба. Зарад. Тракт. Малекула. Лупа. Тонік. Змеявік. Накат. Пакт. Маркес. Дар. Луб. Біруса. Аполак. Сервантэс. Мана.

Zамор'е

## 60 КІЛАГРАМАЎ... НА ГАЛАВЕ!



**У Індыі прайшоў традыцыйны фестываль сікхаў на лепшы галаўны ўбор.**

Каб перамагчы ў гэтым конкурсе, удзельнікі, відаць, гатовыя на ўсё. Кандыдат Ніханг Баба Мэйджар з'явіўся перад строгім журы ў цюрбане, вага якога складала палову ўласнай вагі мужчыны!

Нашэнне доўгіх валасоў і барадаў ужо больш за 300 гадоў з'яўляюцца адметнымі вонкавымі рэлігійнымі прыкметамі сікхаў. Ну а цюрбаны для гэтай касты — не толькі абавязковы галаўны ўбор, але і прадмет гонару. Нездарма ў Індыі велізарнай папулярнасцю карыстаецца штогадовы традыцыйны фестываль сікхаў на самы арыгінальны і ўражлівы цюрбан, пераможцу якога ўшаноўваюць як нацыянальнага героя.

Сёлета прыз дастаўся канкурсанту па імені Ніханг Баба Мэйджар. Летась ён заняў толькі 10-е месца, з'явіўшыся перад суддзямі ў «капелюшы», зробленым з 425 метраў тканіны і вагой 32 кілаграмы. Гэтым разам індус падрыхтаваў да фестывалю Хола Мохала цюрбан з 750 метраў тканіны і вагой амаль 60 кілаграмаў! Утрымаць на галаве такі гмах няпроста, але мужчына паказаў, што ён сапраўдны «аскетычны ваяр», як завуць сікхаў.

Рэлігійныя традыцыі сікхаў былі заканадаўча замацаваныя ў 1699 годзе. Усе мужчыны, якія прапаведуюць сікхізм, акрамя нашэння цюрбана, доўгіх барадаў і валасоў, абавязаныя мець пры сабе тры сталёвых прадметы: кінжал, грэбень і бранзалет. Права «ваяра» на нашэнне зброі і на бясплатны праезд у грамадскім транспарце замацаванае нават у індыйскай канстытуцыі.

## ПАМЯНЯЛІ КОНЕЙ НА КОЛЫ

21 красавіка Рым пачаў адзначаць свой 2762-і дзень нараджэння і ў гонар гэтай урачыстасці пачынаючы з выхадных у сталіцы Італіі праходзіць мноства парадаў, канцэртаў і іншых святочных мерапрыемстваў. Так, у гэтыя выхадныя на старажытным стадыёне Circus Maximus, на якім яшчэ тысячы гадоў таму праходзілі гонкі на калясніцах, прайшлі аналагічныя спаборніцтвы, але на велакалясніцах. Гоншчыкі на веласіпедах, стылізаваных пад старажытнарымскія калясніцы, павінны былі праехаць 3 кругі па стадыёне, што было не такой ужо простай задачай.

**Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.**



## 23 красавіка

Дзве даты

**1794 год** — 215 гадоў таму ў Вільні пачалося нацыянальна-вызваленчае паўстанне. Паўстанцы на чале з Якубам Ясінскім у ноч на 23 красавіка захапілі горад. Паўстанне падтрымалі прадстаўнікі шляхты, рамеснікі, сяляне, узброеныя косамі (касіянеры). 24 красавіка на Рынкавай плошчы Вільні пасля ўрачыстага прыняцця Акта паўстання народа Вялікага Княства Літоўскага было аб'яўлена аб стварэнні Найвышэйшай літоўскай рады (часовага рэвалюцыйнага ўрада). Рада выпусціла маніфест аб далучэнні да паўстання ў Кракаве пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі.



**303 год** — у адпаведнасці з загадам рымскага імператара Дыяклетыяна ў Палесціне абезгалоўлены хрысціянскі воін Георгій Перамаганосец, пазней кананізаваны царквой.

Цытата дня:

*«Я не імкнуся танцаваць лепш за ўсіх — я стараюся танцаваць лепш за сябе самога».*

**Міхаіл Барышнікаў (нар. 1948), расійскі і амерыканскі артыст балета.**

## ВОКНЫ




**Вокны — вочы хаты, яны прызначаны для таго, каб у яе трапляла святло. Але акрамя таго, акно надзелена шэрагам сімвалічных функцый у абрадах сямейнага цыкла ўсходніх славян. У народных павер'ях акно ўспрымалася як выхад (шлях) для нячыстых духаў, смерці. Паўсюдна, птушка, якая заляцела ў акно, прадказвала хуткую смерць. Прадказаннем смерці было і тое, калі птушка стукалася клювам у шыбу. Менавіта таму функцыя акна была найбольш вызначана ў структуры пахавальнага абрада:**

- Калі паміраў чалавек, на вокны вешалі белы ручнік. Тое ж самае рабілі і ў дні ўшанавання памерлых на працягу года.
- У дзень пахавання на акно клалі першы блін для памерлага.
- Паўсюдна лічылі: убачыць у сне хату без вокнаў — да хуткай смерці.
- Калі гаспадары пакідалі хату, вокны абавязкова трэба было закрыць, як закрывалі вочы памерламу: іх забівалі шырокімі дошкамі крыж-накрыж. Такія дзеянні перасцерагалі хату ад таго, каб у ёй пасялілася нячыстая сіла.
- Праз вокны адбываліся так званыя стасункі з душамі продкаў у дні ўшанавання продкаў на працягу года (Дзяды): існавала павер'е, што ў такія дні, калі глядзець у акно з вуліцы ў хату, можна ўбачыць сваіх памерлых сваякоў.
- Паўсюдна быў распаўсюджаны звычай ставіць на падваконне кружку з вадой, каб душы памерлых, калі наведваюць родную хату, маглі памыцца ў гэтай вадзе. Кружку з вадой ставілі на дзявяты, саракавы дзень, год пасля смерці, у іншыя дні ўшанавання памерлых.
- У культуры ўсходніх славян акно супрацьпастаўлялася дзвярам. Яно было «нерэгламентаваным» выхадам для таго, каб «падмануць» нячыстую сілу, смерць, хваробы і г.д.
- Праз акно выносілі памерлых, якія былі нехрышчонымі (звычайна, немаўлят).
- Таксама праз вокны выносілі людзей іншага веравызнання, самазабойцаў. Акрамя таго паўсюдна лічылася, што гэты шлях (выхад з акна) павінен быў заўсёды быць «чыстым» і надзяляўся асаблівай святасцю: праз акно катэгарычна забаранялася пляваць, выкідаць смецце, выліваць брудную ваду і г.д.
- Лічылася, што пад вокнамі стаіць Анёл, які ахоўвае хату і ўсіх яе жыхароў.
- Акно заўсёды мела аканіцы, якія зачыняліся на ноч і адчыняліся з першымі сонечнымі прамянямі, што яшчэ раз падкрэслівае сувязь хаты і жывога чалавека, які таксама раніцай расплюшчвае вочы.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Малады сусветны кінематограф ужо ў Мінску

**Трэці Міжнародны адкрыты фестываль студэнцкага кіно і відэа «Кінагрань» праходзіць у Мінску з 22 па 26 красавіка.**

У яго праграму ўвайшлі больш як сто работ замежных і айчынных аўтараў. А ўсяго на фестываль былі заяўлены 352 фільмы з больш чым 30 краін свету: Аўстраліі, Бельгіі, Вялікабрытаніі, Германіі, Ізраіля, Іспаніі, Ірана, Канады, Францыі, Швецыі, Нідэрландаў і многіх іншых.

Журы адабрала для ўдзелу ў конкурсных паказах больш як 90 замежных і 38 беларускіх фільмаў. У сталічным кінатэатры «Цэнтральны» і ў «Цэнтры-відэа», які знаходзіцца на ніжнім узроўні падземнага гандлёвага комплексу «Сталіца», разгарнуцца паказы ў двух конкурсах: міжнародным «Маладыя прафесіяналы» і нацыянальным — «Незалежнага і аматарскага кіно». Асноўны акцэнт сёлета зроблены на міжнароднай праграме. Арганізатары прадставяць беларускім гледачам унікальную магчымасць убачыць увесь спектр маладога сусветнага кінематографа. Большасць фільмаў праграмы «Маладыя прафесіяналы» — удзельнікі прэстыжных міжнародных кінафестываляў у Канах, Берліне і Лакарна.

У нацыянальную праграму ўвайшло незалежнае і аматарскае кіно. Хтосьці з аўтараў конкурсных работ рыхтуецца стаць прафесіяналам і ўжо робіць першыя сур'ёзныя крокі, а хтосьці здымае відэа дзеля забавы ці для сваіх сяброў. Узнагароды атрымаюць аўтары лепшых дакументальных, гульнявых, музычных і анімацыйных работ і эксперыментальнага кіно. Прадугледжаны таксама і прыз глядацкіх сімпатый. Варта дадаць, што ўсю міжнародную праграму пераклалі на рускую мову студэнты Белдзяржуніверсітэта. Яны ж і будуць чытаць у кінатэатрах пераклады.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Муз-news

## «Тузін Гітоў» «паразагружае» артыстаў па-беларуску

**Інтэрнэт-партал «Тузін Гітоў» і кампанія «Будзьма» распачалі адметны музычны праект «Тузін. Паразагрузка». У ім самыя цікавыя (і, што немалаважна, гатовыя да эксперыментаў) не беларускамоўныя айчынныя выканаўцы розных стыляў запішуць па адным сваім абраным хіту па-беларуску.**

«Мы разумеем, што зачараваць можа музыка хоць на якой мове, калі гэта зроблена таленавіта, — кажа аўтар праекта, галоўны рэдактар партала «Тузін Гітоў» Сяргей Будкін. — Але значэнне слова ў песні таксама нельга прыніжаць. Нам хочацца, каб улюбёныя публікай хіты, створаныя ў Беларусі, прагучалі з новай сілай і на нашай мове». Дапамагчы ў гэтым выканаўцам закліканая каманда прафесійных перакладчыкаў, а пасля дасягнення літаратурнага ўзаемапаразумення песні будуць запісаны на новы лад у студыі і вынесены на суд шаноўнай публікі — уласна на інтэрнэт-партале www.music.fromby.net і сайце кампаніі «Будзьма» www.budzma.org.

Першымі ўдзельнікамі праекта ўжо сталі англамоўны гурт «Hair Peace Salon» з песняй «Ice Age» і гурт «Da Vinci», які выбраў для перакладу з італьянскай кампазіцыю «Bum-Bum».

## «Ляпис Трубецкой» запісалі ва ўкраінскія музыкі

**Але звязана гэта не са зменай грамадзянства і пашпартоў, а толькі з чарговым прызнаннем беларускага калектыву за межамі роднай краіны. Атрымаўшы некалькі значных музычных узнагародаў за леташні альбом «Маніфест» у Беларусі і Расіі, «Ляпісы» працягваюць папаўняць прызавую скарбонку. На гэты раз — украінскай прэміяй «Непапса» ў намінацыі «Альбом года».**



Заснавальнікам гэтай прэміі ў галіне рок-музыкі выступае папулярная ўкраінская радыёстанцыя «Джэм FM». Адпаведна і цырымонія ўручэння ўзнагарод адбывалася ва Украіне — у форме закрытай вечарынкі ў Кіеве. Сярод пераможцаў дамінавалі тамтэйшыя музыкі і калектывы — «Вопли Видоплясова», «Бумбокс», «Esthetic Education», аднак нават ва ўмовах такой сур'ёзнай канкурэнцыі «Ляпис Трубецкой» перамог у адной з галоўных намінацый. Нагадаем, што сёлета на рахунку беларусаў — перамогі ў намінацыях «Гурт года» і «Рок» на ўзнагародах «Гукавая дарожка» (Расія), у намінацыі «Кліп года» на «Чартавым тузіне» (Расія), у намінацыях «Лепшы рок-альбом» і «Прыз вялікага журы» ўзнагароды «Experty.by» (Беларусь), у намінацыях «Гурт года», «Альбом года», «Песня года» на «Рок-каранацыі» (Беларусь).

На пачатку мая ў зборы прэмій выпадзе невялікі перапынак у сувязі з турам гурта па Беларусі. 3 мая «Ляпісаў» чакаюць у Брэсце, 4 мая — у Гомелі, 5 і 6 мая — у Гродне і Лідзе, 7 і 8 мая — у Магілёве і Бабруйску, 9 мая — у Салігорску, 10 мая — у Наваполацку.

## «J:Морс» расфарбавалі вясну блакітам

**Калектыў выпусціў новы альбом «Аквамарын», канцэртная прэзентацыя якога адбудзецца 25 красавіка ў КЗ «Мінск», а прэс-прэзентацыя прайшла нядаўна.**




Для новай пласцінкі было запісана каля 20 песень, але ў выніку ў яе склад трапілі толькі 11 — і 3 бонус-трэкі. Аўтар пераважнай большасці кампазіцый — сам Уладзімір Пугач, 4 песні напісаныя ў сааўтарстве з Вячаславам Бандарэнкам. Як падкрэсліваюць музыканты, па працягласці і дбайнасці работы «Аквамарын» — рэкардсмен з усіх альбомаў гурта, бо праца над ім вялася амаль два гады — з вясны 2007 года. Некаторыя песні давялося перазапісваць па тры, а то і пяць разоў — музыканты шукалі патрэбны гук, а разам з тым і самі сябе... Паралельна знайшлі новую назву для пласцінкі: замест прыдуманых адразу «Знакаў», для якіх ужо і эскіз вокладкі быў гатовы, прыйшлі да «Аквамарыну», паводле назвы адной з песень і па ўласным светаўспрыманні — вясны, абнаўлення і аднаўлення. «Інакш мне давялося б тлумачыць, чаму «Знакі», ударыцца ў эзатэрыку, і вы мне не паверылі б», — з усмешкай разважае Пугач. Абяцае, зрэшты, што пачатковы эскіз і назву таксама калі-небудзь абавязкова выкарыстаюць. Новым «дзіцем» музыканты вельмі задаволеныя — паводле іх ацэнак (па слову ад кожнага), альбом атрымаўся пераходным, разнапланавым, аўтабіяграфічным, іншым, выдатным і «які намацвае штосьці новае».

З уласнага досведу, «Аквамарын» — гэта па-ранейшаму плаўная мелодыка і фірменная, пазнавальная лірыка «морсаў», з новага — хіба крыху большая змрочнасць і нават жорсткасць — зрэшты, не, як трапна заўважыў сам Уладзімір Пугач, ад пачатковых версій застаўся толькі «налёт жорсткасці». Духавыя, новы гітарыст, пошукі сябе... Але ў суме атрымалася цікава. Са знакам «плюс» або «мінус», аднак гэты альбом абавязкова зачэпіць слухачоў — як ранейшых, так і новых. Хоць асабіста я ўсё ж раіла б навічкам пачынаць знаёмства з гуртом з альбомаў «Басанож па маставой» ці «Монтэвідэо».

## Паліна Смолава скажа ў Мінску «Пяць слоў пра каханне»

**Упершыню пасля ад'езду ў Маскву спявачка збіраецца прыехаць у Беларусь з сольнымі канцэртамі — дакладней, з гастрольным турам, старт якому дасць канцэрт 23 красавіка ў Мінску. Праграма, якую прадэманструе Паліна Смолава слухачам, названа па адной з новых кампазіцый — «Пяць слоў пра каханне». (Прычым у Маскве яна, што адметна, будзе абвешчана з крыху іншымі акцэнтамі — «Пяць словаў пра любоў да Беларусі»).**

Аўтарам загаловачнай песні з'яўляецца сама Паліна. «Вельмі доўга чакала таго моманту, калі мяне наведае муза і я нарэшце змагу выказаць у песні свае пачуцці і перажыванні. Спадзяюся, гэта не апошні мой кампазітарскі вопыт», — расказвае спявачка і дадае, што песня атрымалася душэўнай і прафесійнай. У канцэртнай праграме прагучаць таксама як ужо знаёмыя публіцы хіты — «Сайт адзіноты», «На ўскрайку кантрольнай паласы», так і новыя кампазіцыі — «Усю ноч», «Ён не варты тваіх слёз» і іншыя.



Што да гастрольнага туру, то ён атрымае працяг у маі і будзе насіць дабрачынны характар. Паліна Смолава і яе творчая каманда плануюць не толькі выступіць у розных гарадах, але ў кожным з іх наведаць дзіцячыя дамы, наладзіць імправізаваныя канцэрты і раздаць дзецям падарункі.

## Георгій Калдун: дзве акустыкі, калі ласка

**Выпусціўшы летась свой дэбютны альбом «Фрагменты», спявак і тэлевядучы вырашыў не чакаць, пакуль дыск трапіць у рукі да ўсіх зацікаўленых і прыхільнікаў, і зрабіў акустычную версію альбома, з якой цяпер выступае па ўсёй Беларусі.**

Дапамаглі выканаўцу рэалізаваць гэту даўнюю мару музыканты з гурта «Hush» — атрымалася «мяккая» акустычная версія з саксафонам, клавішнымі і дзвюма гітарамі — 6- і 12-струннай. Такі варыянт выйгрышны для ўсіх бакоў — музыкантам не трэба арандаваць ці вазіць з сабой грувасткую апаратуру, змяншаюцца выдаткі ў арганізатараў, а значыць, і для слухачоў цэны білетаў больш чым прымальныя. «Гэткае выступленне да месца ў любой зале, і пры тым нам не даводзіцца ахвяраваць «жывым гукам», — дадае Георгій Калдун. — Акрамя таго, акустычныя канцэрты даюць магчымасць стварыць у зале больш утульную атмасферу».

Слухачы знаходку ацанілі: акустычная праграма ўжо прадэманстравана больш як у 30 беларускіх гарадах, у гастрольным графіку яшчэ столькі ж. Прычым шмат дзе адбываюцца так званыя канцэрты-«двайнікі» — у адным горадзе з-за вялікага попыту на білеты ладзяцца адзін за адным два аналагічныя канцэрты. Яшчэ адна адметнасць гэтых выступленняў — кантакт з публікай, дакладней, пытанні з залы, якую Георгій наўмысна правакуе на дыялог. Часцей за ўсё, паводле слоў спевака, цікавяцца, як трапіць на гульню «Адзін супраць усіх», высвятляюць, ці свабоднае сэрца артыста і што ён робіць пасля канцэрта. Але, бывае, пытаюцца і пра іншае: стаўленне да народнай музыкі, беларускамоўны рэпертуар. «Было пытанне, якое паставіла мяне ў тупік: «Гэта ваш брат вядзе праграму на тэлебачанні?». Адказаў: «Так. Трэці!» — са смехам узгадвае артыст.



**Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Усміхнёмся!

**У заапарку:**

**— Спадарыня! Не трэба так настойліва карміць бегемота марожаным! І наогул, у яго галава з іншага боку!**

☺

У гасцях добра, а дома — камп'ютар...

☺

**Ад стваральнікаў часопіса «Адпачні» — навінка: часопіс «Напружся».**

**Самыя складаныя крыжаванкі — без адказаў на апошняй старонцы, анекдоты на японскім, у арыгінале, а таксама для самых маленькіх — малюнак-загадка: «Знайдзі 8 тысяч адрозненняў».**

☺

Суддзя:

— А што вы рабілі 4 гады таму 26 сакавіка ў 3 гадзіны дня?

— Ляжаў на канапе пасля дзвюх чарак гарэлкі і чытаў дэтэктыў Данцовай на 128-й старонцы.

— Цікава! Як вы ўсё гэта запомнілі?

— У гэты час да нас прыехала жыць цешча!




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.444 Індэкс 63850. Зак. № 2196. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12